СОЮЗ БЕЛАРУСЬ — РОССИЯ стар. 31–38

№7 (994), ЛІПЕНЬ, 2016
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

ISSN 0320-7544

Палітыка, эканоміка, культура



# ДА НАС ЗАВІТАЛА ЛЕТА

INTERNATIONAL

The Minsk Times

Socio-political Weekly

Пра падзеі ў Беларусі і свеце

Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску

Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ





**10** **Заўтрашні дзень бачыцца канкрэтна**

**12** **Краіна і мір зрабіліся сінонімамі** Беларусь адыгрывае важную ролю ў захаванні стабільнасці ў рэгіёне




**16** **У карэце мінулага далёка не паедзеш**

**18** **У вынаходніцтве важна не спазніцца** Нам, жыхарам Беларусі, якія спазналі сіндром Чарнобыля, цяжка неяк інакш успрымаць радыяцыю. Але ж ёсць ад яе — калі радыяцыя кіруемая і падкантрольная — вельмі эфектыўная карысць

**20** **Атрымаць месца ў вёсцы, не выязджаючы з горада** На карце Мінска “Студэнцкая вёска” — гэта асобны вялікі мікрараён. Не спальны

**28** **Мы бачым і чуем адзін аднаго** Упершыню тэлемост злучыў гарады-пабрацімы Мінск і Новасібірск

**39** **Удзячнасць назаўжды** Тысячы людзей прайшлі “Дарогай памяці”, пракладзенай у Брэсцкай крэпасці да плошчы Цырыманіялаў

**40** **Попел ляціць у вечнасць** Маленькая дзяўчынка Соня Яскевіч цудам выратавалася ў вогненнай Хатыні...

**42** **Урокі Дзіны Тамашэвіч**

**44** **“Ні межаў, ні мытняў — і гэта выдатна...”** Народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін, які нядаўна адзначыў 70-годдзе, расказаў пра свае лепшыя ролі, пра здымкі ў серыялах і пра тое, чаму ён не любіць сучасныя фільмы

**48** **У Міры пабывала прынцэса дэ Бурбон Пармская**

**50** **Не столькі адзенне, колькі чыстае мастацтва**






**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 7 (994), ліпень, 2016**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”, ААТ “Белзнешэканамбанк”

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**“Беларусь.Belarus”** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **“Беларусь. Belarus”** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”. Вул. Б. Хмяльніцкага, 10ª, 220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”. Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004. Пр-т Незалежнасці, 79, г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 08.07.16 г.
Выпуск у свет 25.07.16 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60х90 1/8. Друкаваных аркушаў 7. Гарнітура Міньён.

**Заказ №1632**
**Агульны тыраж** — 1938 экз.
(на беларускай мове — 190)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24, +375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.

**Цана дамоўная.**


© **“Беларусь. Belarus”**, 2016

# Час, багаты на падзеі

Палітычная актыўнасць — справа не сезонная. Яна ці ёсць — у любы час года, ці яе няма. Многае залежыць ад незаспакоенасці ў складанні планаў, ад імкнення знаходзіць выхад з няпростых эканамічных сітуацый. Час не чакае, калі выбраны амбіцыйныя арыенціры, калі ёсць разуменне таго, што шмат трэба зрабіць: не заўтра, а ўжо сёння.



Важнай палітычнай падзеяй — падзеяй года, не менш — стала правядзенне Усебеларускага народнага сходу. Па сутнасці, гэта маштабны форум, які вызначае рух краіны як мінімум на бліжэйшыя пяць гадоў. Выверанасць калектыўнай пазіцыі, якая фарміравалася менавіта на сходзе, мае прынцыповае значэнне.

Тэме Усебеларускага сходу прысвечана цэлая серыя матэрыялаў у гэтым выпуску часопіса.

Нельга не сказаць яшчэ пра адну падзею, якая ў большай ступені мае міжнародны характар. Размова пра саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, у якім Беларусь упершыню прымала ўдзел у статусе назіральніка. Так, краіна паступова, але ўпэўнена, займае паўнапраўнае месца ў адной з уплывовых глабальных структур. Першапачаткова задачы ШАС ляжалі ў сферы ўнутрырэгіянальных дзеянняў па спыненні тэрарыстычных актаў, сепаратызму і экстрэмізму ў Сярэдняй Азіі. Аднак па меры развіцця арганізацыі пытанні бяспекі былі дапоўнены эканамічным блокам, уключаючы энергетыку, транспарт, АПК, тэлекамунікацыі, а таксама гуманітарным вымярэннем. На думку Прэзідэнта менавіта Беларусі, эканамічная кааперацыя павінна стаць магістральным напрамкам узаемадзеяння ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Чытайце публікацыю ***“Дарожная карта” актыўных дзеянняў”.***

Зрэшты, насычанасць жыцця складваецца не толькі з падзей, няхай і найважнейшых, чыста палітычнага зместу. Не менш важным уяўляецца злабадзённасць спраў, якія, уласна, і пацвярджаюць рэальнасць палітычных намераў. Каб вялікая колькасць планаў не аказалася фікцыяй. Добры прыклад той, які матэрыялізуе некалі намечанае ў ажыццёўленае. Публікацыя ***“Атрымаць месца ў вёсцы, не выязджаючы з горада”*** якраз расказвае пра такое. Вось невялікая вытрымка з матэрыялу:

“Усяго шэсць гадоў назад тут была пустка. Ускраіна Мінска. Але блізкасць да карпусоў Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта і станцыі метрапалітэна прымусілі прыглядзецца да месца больш уважліва. Так, адна за адной выраслі сем прыгожых шматпавярховак. Комплекс будынкаў назвалі “Студэнцкая вёска”.

За некалькі гадоў новенькія інтэрнаты абраслі магазінамі і гандлёвымі цэнтрамі. Быў узведзены спартыўны комплекс. Не так даўно ў прыбудове аднаго з інтэрнатаў адкрылі яслі-сад, якія прымаюць не толькі дзетак студэнцкіх сем’яў, але і з суседняга спальнага мікрараёна Брылевічы. Хутка ў маладзёжным гарадку адкрыюцца гасцініца, паліклініка, пункты бытавога абслугоўвання, падземныя аўтастаянкі, культурна-забаўляльны цэнтр. Інфраструктуру абяцаюць круцейшую, чым у кампусах некаторых еўрапейскіх універсітэтаў.

І напрыканцы невялікі культурны экскурс. Сёння відавочна, што атрыманне суверэнітэту Рэспублікай Беларусь у 1991 годзе азнаменавала і цалкам новы этап мастацкай культуры. За гады незалежнасці ў грамадстве адбыліся істотныя змены, пачаўся працэс абнаўлення, рэалізацыі інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу. З асаблівасцямі развіцця айчыннага мастацтва ў кантэксце традыцый і сучаснасці, творчай пераемнасці і эксперыментальных пошукаў знаёміць выстава “Сучасная Беларусь вачамі мастакоў”, якая адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі

Часопісная публікацыя пра выставу прадстаўлена матэрыялам ***“Карціны як факты з біяграфіі краіны”.***

Але лепш знайсці час і асабіста пабываць на выставе. Яна таго вартая.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**






**У пяты раз у краіне прайшло народнае веча. І штораз яно знаменавала важныя моманты ў развіцці дзяржавы. Цяперашні Усебеларускі народны сход адкрыўся 22 чэрвеня. Гэта знакавая дата для кожнага беларуса. У ёй крыецца вялікі сэнс: людзі змаглі аб'яднацца і толькі дзякуючы гэтаму выстаяць, прайсці праз гады ліхалецця, стварыць сваю дзяржаўнасць, навучыцца абараняць суверэнітэт і ісці па шляху будаўніцтва квітнеючай Беларусі. І невыпадкова работа маштабнага форуму сёлета пачалася з хвіліны маўчання ў памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.**

# За будучыню ў адказе кожны




БЕЛТА

**Сёння перад краінай стаяць найскладанейшыя задачы. Гэта датычыцца глабальных выклікаў у эканоміцы і палітыцы. У чым прычыны ўзніклых цяжкасцяў? Што мы рабілі правільна, а ў чым, магчыма, памыляліся? І галоўнае, што чакае нас у перспектыве? Якім курсам пойдзе наша дзяржава далей? На ўсе гэтыя пытанні і заклікана было адказаць веча. З дакладам перад яго ўдзельнікамі выступіў Прэзідэнт.**



БЕЛТА

## Пра бяспеку

Наша краіна здольная абараніць свой суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць. Рэалізуецца комплекс мерапрыемстваў па ўдасканаленні сістэмы аховы дзяржаўных межаў, у першую чаргу на паўднёвым напрамку. Выстаўлены новыя падраздзяленні, ствараецца інтэграваная сістэма аховы мяжы, укараняюцца сучасныя ўзоры ўзбраення і тэхнікі. Аляксандр Лукашэнка зробленае ў сферы бяспекі абазначыў ёміста: “Створаная сістэма — гэта эфектыўны шчыт на шляху тэрарызму, наркатрафіку і нелегальнай міграцыі”. Адной з найважнейшых задач у ваеннай сферы з’яўляецца забеспячэнне войскаў найноўшым узбраеннем і тэхнікай, без гэтага немагчыма абараніць родную зямлю: “Нашы навукоўцы сумесна з арганізацыямі абароннага сектара эканомікі распрацавалі і паспяхова выпрабавалі ва ўмовах густанаселенай Беларусі, а не на пустэльных палігонах, рэактыўную сістэму залпавага агню “Паланэз”, адпаведную лепшым сусветным узорам высокадакладнай зброі”.

У перспектыве прадоўжыцца развіццё ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй у сістэме рэгіянальнай групоўкі войскаў, а таксама з краінамі АДКБ ды іншымі дзяржавамі.

“Выбудоўванне міралюбнай і добрасуседскай палітыкі, непрымальнасць выкарыстання сілы ў вырашэнні міжнародных супярэчнасцяў дазволілі нам стаць асноўнай пляцоўкай для перагавораў па ўрэгуляванні ўзброенага канфлікту ў нашай роднай Украіне”. Сёння сусветная супольнасць разглядае Беларусь як донара рэгіянальнай бяспекі.

## Пра праграму развіцця

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады накіравана ў будучыню і прадугледжвае канкрэтныя дзеянні, перакананы Прэзідэнт: “Гэта праграма развіцця, а не застою; праграма будучыні, а не мінулага; праграма дзеянняў, а не спадзяванняў. Мы добра разумеем: праблемы не вырашацца самі сабою, крызісныя з’явы не знікнуць па ўзмаху чароўнай палачкі. Менавіта таму ў аснову праграмы пакладзены прынцыпы прагрэсу і адкрытасці. Мы робім стаўку на веды і тэхналогіі. У гэтым ключ да вырашэння бягучых праблем і руху наперад”.

І яшчэ са сказанага Прэзідэнтам: “Трэба адчуваць момант, ведаць і разумець, калі можна рабіць тыя ці іншыя радыкальныя крокі. Тое, што яны патрэбныя ў асобных момантах — гэта так. Але што будзе, калі мы ў перыяд, калі трэба згуртавацца, арганізавацца, не дапусціць далейшага падзення, ісці выверана, як па тонкім лёдзе, пачнём ламаць гэты лёд? Зразумела, што адбудзецца”.

## Пра народаўладдзе

Усебеларускі сход з’яўляецца рэальна дзеючым механізмам народаўладдзя, упэўнены Прэзідэнт: “Права чалавека і грамадзяніна на ўдзел у кіраванні справамі дзяржавы з’яўляецца неад’емным патрабаваннем часу”. Дэвіз “Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь” сімвалізуе пераемнасць і згуртаванасць грамадства на карысць Радзімы: Усебеларускі народны сход па праву з’яўляецца адной з важнейшых формаў прамой дэмакратыі і грамадскім інстытутам сучаснай Беларусі, які апраўдаў сябе: “Шчырая і сумленная размова з людзьмі стала нормай жыцця для ўлады і ўсіх службовых асобаў дзяржавы”.

## Пра апераджальную стратэгію

“Размова не пра нейкую кардынальную ломку і перабудову ўсяго. Падкрэсліваю: патрэбна ўдасканаленне таго шляху, які выбралі і па якім даволі паспяхова прайшлі першыя два этапы аднаўлення і стабілізацыі. На новым этапе нам неабходна перайсці ад “даганяючай” стратэгіі да “апераджальнай”, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму, каб асвоіць новыя нішы, нам трэба працаваць напорыста, калі хочаце, агрэсіўна і, галоўнае, рэзультатыўна, максімальна скарачаць выдаткі, зніжаць сабекошт прадукцыі, эканоміць фінансавыя рэсурсы”.

Якія фактары перашкаджаюць руху наперад? Перш за ўсё гэта невысокая прадукцыйнасць працы, якая дасягнула ўзроўню 20 тысяч долараў і якая не змяняецца тры гады. Яшчэ адным фактарам Прэзідэнт назваў нізкую інавацыйную актыўнасць. “Захоўваецца амаль трохразовае адставанне ад высокаразвітых краін па долі высокіх тэхналогій у прамысловасці. Вынік — мы выпускаем прадукцыю з невысокай дабаўленай вартасцю і нізкай тэхналагічнасцю”. Трэці фактар — недастаткова эфектыўная інвестыцыйная стратэгія прадпрыемстваў і цэлых галін.

## Пра інвестыцыі

У Беларусі за пяцігоддзе неабходна рэалізаваць больш за 80 буйных інвестыцыйных праектаў на суму звыш 27 міль-

ярдаў долараў: “Асноўная навізна інвестыцыйнай палітыкі заключаецца ў наступным: ільготнае крэдытаванне ўсіх новых праектаў і праграм будзе ажыццяўляцца сумленна і адкрыта праз адзінага аператара. Галоўны прынцып — конкурснае размеркаванне сродкаў, перавага будзе аддавацца акупнасці і зваротнасці рэсурсаў. Асаблівая роля будзе адведзена знешнім крыніцам фінансавання, у аснове — замежныя інвестыцыі”.

Дарэчы, аб’ём замежных інвестыцый у эканоміку Беларусі за апошнія пяць гадоў вырас у 2,5 раза.

Па памеры ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці Беларусь ужо ўвайшла ў лік краін з сярэднім узроўнем даходу. Гэты паказчык вырас з 5,2 тысячы долараў у 1990 годзе да 16,5 тысячы ў 2010 годзе і амаль да 18 тысяч у 2015-м.

## Пра мадэрнізацыю

Задача на бліжэйшыя 5 гадоў — пераадолець адставанне і трывала заняць сваю нішу ў сусветнай эканоміцы. Асновай руху наперад на сучасным этапе павінны стаць новыя падыходы да мадэрнізацыі эканомікі і эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне. У цяперашні час пад аператыўным кіраваннем міністэрстваў і канцэрнаў знаходзяцца 1005 арганізацый — амаль палова чыстых актываў эканомікі. Але пры гэтым іх уклад у агульную выручку па краіне складае толькі чвэрць (прыкладна 25 працэнтаў). Лічбы наглядна паказваюць, што эфектыўнасць дзейнасці гэтых прадпрыемстваў застаецца невысокай. “Адна з прычын такога становішча спраў — нізкая якасць кіравання, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Трэба ўмацаваць гаспадарчую самастойнасць, засяродзіць увагу на захаванні акцыянернага кошту і эфектыўнасці працы, скараціць выдаткі і тым самым павялічыць прадукцыйнасць працы”.

## Пра “зялёную” эканоміку і веды

На парадку дня — пераход да “зялёных” тэхналогій і эканомікі ведаў. Выпуск інавацыйнай прадукцыі за пяцігодку павялічыўся больш як у 4 разы. У краіне ёсць значныя напрацоўкі ў сферы высокіх тэхналогій, у прыватнасці, у вытворчасці аптычных і лазерных прыбораў, аўтаматызаваных сістэм кіравання. Шырокую вядомасць у свеце набыў шэраг камп’ютарных праграм беларускіх распрацоўшчыкаў. Па экспарце ў галіне камп’ютарных і інфармацыйных паслуг на душу насельніцтва краіна апярэджвае ўсе краіны Садружнасці.

У рэйтынгу па ўзроўні развіцця адукацыі Беларусь знаходзіцца ў групе 30 развітых краін і апярэджвае ўсе краіны СНД.

ВУП Беларусі за першыя дзесяць гадоў новага тысячагоддзя павялічыўся амаль у 2 разы, рэальныя грашовыя даходы — больш як у 3 разы. Удалося вырашыць і праблему харчовай бяспекі, многія іншыя значныя пытанні.

У нас таксама ёсць бясспрэчныя поспехі ў галіне сацыяльнай палітыкі. “Пацвярджэнне таму — выкананне ўжо ў 2015 годзе вызначаных Дэкларацыяй ААН мэт тысячагоддзя. Па індэксе чалавечага развіцця Беларусь сярод амаль 200 краін сусветнай супольнасці перамясцілася з 68-га месца ў 2000 годзе на 50-е месца ў 2015-м. Гэта забяспечыла нам месца ў групе краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця. З 2014 года ўпершыню за 20 гадоў колькасць жыхароў у Беларусі пачала расці. Узроўні нараджальнасці і смяротнасці практычна зраўняліся — сцiснуты дэмаграфічныя нажніцы. Гэта вынік, да якога мы імкнуліся і якім ганарымся”, — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## Пра фінансы

Сістэмная работа па ўмацаванні даверу да беларускага рубля павінна быць працягнута, лічыць Прэзідэнт: “Без дасягнення ўстойлівых штогадовых тэмпаў інфляцыі ніжэйшых за 5 працэнтаў будзе складана аздаравіць эканоміку ў цэлым. Ураду і Нацыянальнаму банку неабходна прадоўжыць сістэмную работу па ўмацаванні даверу да беларускага рубля, забеспячэнні ўстойлівага росту золатавалютных рэзерваў, падтрыманні іх на бяспечным узроўні, павысіць эфектыўнасць бюджэтных выдаткаў і скараціць знешнюю пазыку”.

## Пра дзяржапарат

У нашай краіне адзін з самых кампактных дзяржаўных апаратаў у свеце, але яго работа недастаткова эфектыўная. Калі параўнаць расходы на ўтрыманне дзяржапарату ў розных краінах, то ў Беларусі іх доля ніжэйшая і складае 2 працэнты ВУП. У 3,5 раза вышэйшы гэты паказчык у Еўрапейскім саюзе, у 2 разы — у Расіі.

Неабходнасць кардынальнага ўдасканалення сістэмы дзяржкіравання ў мэтах павышэння яго эфектыўнасці наспела даўно, і для гэтага патрэбны цэлы шэраг мер. Прэзідэнт лічыць, што ў дзяржаўны апарат трэба прыцягнуць самых лепшых, самых кампетэнтных. Павінен быць павышаны прэстыж работы дзяржслужбы. Ва ўсім свеце за разумных і энергічных спецыялістаў ідзе барацьба. Іх прыцягваюць высокімі зарплатамі, прэміямі, сацыяльнымі пакетамі. Гэта рэаліі канкурэнтнай барацьбы за інтэлект: “Аптымізацыю дзяржапарату не варта зводзіць да простага скарачэння колькасці штату, трэба забяспечыць дзяржкіраванне на якасна больш высокім узроўні. Каб сфарміраваць у людзей разуменне, што дзяржава — гэта не донар або кантралёр, а партнёр, які стварае ўмовы для паспяховага развіцця прадпрыемстваў, рэгіёнаў і краіны ў цэлым”.

Прэзідэнт таксама запатрабаваў ад работнікаў дзяржапарату большай самастойнасці ў прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў і, звяртаючыся да Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, Прэм’ер-міністра і старшыні Мінаблвыканкама, даручыў: “Пакладзіце мне на стол прапановы па скарачэнні дзяржаўнага апарату ў 1,5-2 раза (лепш у 2 разы) і паралельна — сістэму мер па няўхільным выкананні прынятых рашэнняў”.

## Пра навуку

Нам неабходна спрасціць умовы камерцыялізацыі вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці: “Па прыярытэтных для краіны напрамках праз дзесяць гадоў мы павінны ўвайсці ў лік краін-лідараў. Першарадная задача — павышэнне долі высокатэхналагічнай і сярэднетэхналагічнай вытворчасцяў. Неабходна наблізіцца да паказчыкаў вядучых краін свету: давесці высокатэхналагічны сектар да 5 працэнтаў і сярэднетэхналагічны да 50 працэнтаў у структуры эканомікі”.

Прэзідэнт паставіў перад буйнымі прамысловымі аб'яднаннямі і навуковымі арганізацыямі задачу стварыць навуковыя цэнтры па распрацоўцы новых матэрыялаў:

## Пра льготы

Парадак выплаты падаткаў павінен быць як мага больш простым, лічыць Аляксандр Лукашэнка: “У сельскай мясцовасці новыя прадпрыемствы будуць вызвалены на два гады ад выплаты падаткаў на прыбытак і на нерухомую маёмасць”. Таксама трэба стварыць цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва на тэрыторыі раёнаў з колькасцю насельніцтва звыш 30 тысяч чалавек: “Усё гэта дасць магчымасць актывізаваць развіццё прадпрымальніцтва, у тым ліку ў рэгіёнах, і ўцягваць у працоўную дзейнасць больш людзей”.

## Пра новыя працоўныя месцы

“Удасканаленне структуры эканомікі непазбежна вядзе да вызвалення залішняй колькасці работнікаў. Каб не дапусціць рэзкага скачка беспрацоўя, трэба прыняць папераджальныя меры: палепшыць работу службаў занятасці, наладзіць перападрыхтоўку спецыялістаў, спрасціць умовыператоку рабочай сілы паміж рэгіёнамі і галінамі. І галоўнае — новыя працоўныя месцы, высокапрадукцыйныя. Іх за пяцігоддзе трэба стварыць больш за 250 тысяч”, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Для гэтага трэба задзейнічаць канкурэнтаздольныя фінансавыя механізмы: “Праз нашы банкі адкрываецца доступ да фінансавых інструментаў і рынкаў Еўрасаюза, сродкаў міжнародных фінансавых арганізацый. Айчыннымі банкамі можа быць прадастаўлена прыватнаму бізнесу каля мільярда долараў кітайскіх крэдытаў ужо цяпер”.

## Пра моладзь

Амаладжэнне кадравага складу кіраўнікоў, стварэнне ўмоў для праяўлення здольнасцяў маладога пакалення з'яўляюцца найважнейшым напрамкам арганізацыйнай і ідэалагічнай работы Адміністрацыі Прэзідэнта і ўсёй вертыкалі ўлады, адзначыў Прэзідэнт: “Неабходна прадоўжыць работу па ўдасканаленні сістэмы падтрымкі адоранай, таленавітай, з лідарскімі якасцямі моладзі, раскрыцці яе творчага патэнцыялу”.

Вялікую ўвагу варта надаць фарміраванню павагі да сямейных каштоўнасцяў. Падтрымка маладых сем'яў заўсёды была і застанецца адным з галоўных клопатаў дзяржавы. Бо, калі моладзь мае добрыя бытавыя ўмовы, яна імкнецца стварыць сваю сям'ю, мець дзяцей, а значыць, узрастае гарантыя яе замацавання на месцах. А органам дзяржкіравання, буйным прадпрыемствам, бізнесу неабходна актыўна ўключацца ў адбор і прасоўванне таленавітых маладых людзей: “Выхоўваць кадры, пачынаючы з ВНУ, а то і са школы, прапаноўваць навучальныя праграмы, стажыроўкі і практыку на прадпрыемствах. Імкнуцца зацікавіць чалавека прафесіяй. Гэта дазволіць выгадаваць годную змену і забяспечыць упэўненую будучыню краіны”.

Далейшае развіццё атрымаюць валанцёрскі і студатрадаўскі рухі. Цэнтральную ролю ў гэтай маштабнай рабоце павінна адыграць вядучая маладзёжная арганізацыя — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

## Пра атамную станцыю

У цяперашняй пяцігодцы дынамічнае развіццё атрымае энергетычны комплекс краіны. Так, у 2018-2020 гадах пачнуць працаваць абодва блокі Беларускай АЭС. Будзе створана каля 2 тысяч працоўных месцаў: “Гэта крок да патаннення энергарэсурсаў, а такім чынам, база павышэння канкурэнтаздольнасці ўсіх сектараў эканомікі: прамысловасці, транспарту, сферы паслуг. Беларусі неабходна выкарыстаць перавагі ядзернай энергетыкі для фарміравання вакол атамнай станцыі кластара энергаёмістых вытворчасцяў. Трэба сфарміраваць умовы для пераходу ад выкарыстання прадпрыемствамі і грамадзянамі прыродных рэсурсаў, напрыклад, газу і нафты, на адносна недарагую электраэнергію”.

## Пра еўразійскую інтэграцыю

“У апошнія гады і Расія, і Казахстан стварылі шэраг вытворчасцяў, аналагічных тым, што ёсць у Беларусі. Хоць дамаўляліся не пра гэта. Па сутнасці, такія дублюючыя вытворчасці ствараюць залішні ціск на агульным рынку нашых краін. Прадпрыемствы вымушаны канкурыраваць паміж сабою, у той час як стратэгічна больш правільна, наадварот, узмацніць спецыялізацыю на асобных сегментах і развіваць кааперацыйныя сувязі. Навошта траціць рэсурсы, якіх і так мала, на стварэнне таго, што ўжо ёсць, нават калі б гэтых рэсурсаў было шмат? Бо вытворчасць — гэта яшчэ і навуковая, канструктарская школа, сістэма падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. І ўсё гэта каласальныя выдаткі”, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ураду і ўпаўнаважаным службовым асобам неабходна актыўней вырашаць пытанні ў статутных органах Еўразійскага эканамічнага саюза.

## Пра супрацоўніцтва з ЕС і ЗША

“Каб дынамічна развівацца, неабходныя нармальныя адносіны з Еўрапейскім саюзам і ЗША. Апошнія гады адзначаны пацяпленнем нашых узаемаадносінаў. Адмова ад санкцыйнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі адкрывае новыя магчымасці ў развіцці ўзаемадзеяння. І было б грэшна гэтым не скарыстацца, — заявіў Прэзідэнт. — Нам, па вялікім рахунку, трэба наганяць упушчанае і выйсці для пачатку на той узровень адносінаў з ЕС і ЗША, які існуе ў нашых партнёраў па ЕАЭС і СНД”.

Еўрасаюз — другі па значнасці рынак для беларускага экспарту, а таму канструктыўнае разнапланавае супрацоўніцтва з Еўрасаюзам адпавядае нацыянальным інтарэсам: “Ключавая задача на перспектыву — поўная нармалізацыя адносінаў і выхад на заключэнне базавага пагаднення паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам”.

## Пра будучыню СНД

Садружнасць Незалежных Дзяржаў ні ў якай меры не вычарпала сваіх магчымасцяў, упэўнены Прэзідэнт: “Інтэграцыйныя працэсы на прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў цяпер перажываюць складаныя часы. Падзяляючы меркаванне аб безумоўнай неабходнасці мадэрнізацыі Садружнасці, лічым мэтазгодным захаваць яе як міжнародную арганізацыю. Задача — узмацніць эканамічнае ўзаемадзеянне і зрабіць Садружнасць больш прывабнай для дзяржаў-удзельніц”.

## Пра ўзаемаадносіны з Кітаем

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь за апошнія некалькі гадоў рэалізавала стратэгічныя рашэнні па ўмацаванні эканамічных сувязяў з Кітайскай Народнай Рэспублікай і вывела двухбаковыя адносіны на ўзровень усебаковага стратэгічнага партнёрства: “Неабходна, каб інавацыйны, інвестыцыйны складнікі ў бліжэйшай будучыні вызначалі характар узаемаадносінаў з Вялікім Кітаем. Таму сёння вельмі важна генерыраваць бізнес-ідэі, прадуманыя, пралічаныя з улікам рэалій рынку, інвестыцыйныя праекты, якімі варта прыцягваць кітайскіх інвестараў”.

## Пра высокія тэхналогіі

Некалькі гадоў назад мы сур’ёзна ўзяліся за інфарматызацыю. Першыя вынікі работы ўжо адзначаны ў свеце. Так, паводле дадзеных Міжнароднага саюза электрасувязі, Беларусь па ўзроўні развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій апярэдзіла ўсе краіны СНД, а таксама краіны Усходняй Еўропы. “Мы ўшчыльную наблізіліся да першай трыццаткі самых развітых краін свету ў дадзенай сферы. Але гэта толькі пачатак. У наступную пяцігодку мы ставім перад сабою амбіцыйную задачу — стаць лідарам у нашым рэгіёне, ва Усходняй Еўропе”, — сказаў Прэзідэнт. Размова ў дадзеным выпадку ідзе не пра паказчыкі: “Паскораная інфарматызацыя — гэта не даніна модзе. Гэта залог выжывання і канкурэнтаздольнасці ўсёй нашай эканомікі”.

## Пра прыродныя багацці

Прэзідэнт даручыў Ураду падрыхтаваць стратэгію больш актыўнага выкарыстання нетраў: “У краіне ёсць магутны комплекс па разведцы нетраў, назапашаны найбагацейшы досвед геолагаразведкі, асваення радовішчаў. Як выкарыстоўваць гэты патэнцыял на знешніх рынках, павінна быць адлюстравана ў стратэгіі”. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў актыўней выкарыстоўваць патэнцыял вытворчага аб’яднання “Беларуснафта”, інстытута “Белгорхімпрам”, НВЦ па геалогіі: “Бо ёсць яшчэ краіны, якія “сядзяць” на радовішчах, але самі здабываць не ўмеюць. Мы павінны канвертаваць свой напрацаваны гадамі досвед геолагаразведкі і здабычы ў валюту. Прыток інвестыцыйных рэсурсаў, высокіх тэхналогій дасць магчымасць падняць на новы ўзровень усе галіны нашай эканомікі”.

## Пра пенсіі

“У гэтай пяцігодцы мы прыступім да рэфармавання і сістэмнага ўдасканалення нашай пенсійнай сістэмы. Каб не дапусціць зніжэння ўзроўню пенсій і рэгулярнасці іх выплат, трэба было пераглядзець тэрміны выхаду людзей на заслужаны адпачынак. Пастаўлена задача забяспечыць узровень пенсій у памеры 40 працэнтаў ад заработнай платы — сусветны стандарт”, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Нельга забываць аб стварэнні зручнага асяроддзя жыццядзейнасці для людзей з абмежаванымі магчымасцямі: “Гэта важная задача, і мы яе павінны вырашаць. На працягу пяцігодкі безбар’ернае асяроддзе будзе створана больш як на 3,5 тысячы аб’ектаў краіны”.

## Пра экспарт

Развіццё экспарту Прэзідэнт назваў адным з прыярытэтаў, паколькі гэты фактар у значнай ступені ўплывае на дабрабыт усёй краіны: “Цяпер на першы план выходзіць такі аспект, як дыверсіфікацыя экспарту, асваенне новых рынкаў збыту тавараў і паслуг. Першачарговая задача — выхад на новыя знешнія рынкі і ўзмацненне пазіцый на традыцыйных”.

Прэзідэнт адзначыў, што першы год работы Еўразійскага эканамічнага саюза быў няпростым. У гэтым пяцігоддзі мы павінны дабіцца практычнай рэалізацыі дамоўленасцяў, а таксама істотна прасунуцца наперад у ліквідацыі абмежаванняў, якія засталіся ва ўзаемным гандлі: “Рэальна ацэньваючы патэнцыял традыцыйных рынкаў, мы прыходзім да высновы пра важнасць больш значнай прысутнасці беларускіх тавараў і паслуг у Еўропе, Азіі, Амерыцы, Афрыцы. Асабліва складаная, але неабходная справа — пераарыентацыя экспарту з бліжэйшых рынкаў на краіны Азіі, Амерыкі, Афрыкі. Бо з краінамі “далёкай дугі” плануем прырост экспарту да 52 працэнтаў да цяперашняга ўзроўню”.


БЕЛТА

Для кардынальнага спрашчэння і аблягчэння працэдуры экспартнага крэдытавання ў краіне на базе Банка развіцця будзе створана спецыялізаванае агенцтва па садзейнічанні экспарту, якое працуе па прынцыпе аднаго акна. Спатрэбіцца больш эфектыўная работа дыпламатычнага корпуса, спецыялістаў у галіне знешнегандлёвай дзейнасці, нараўне з кіраўнікамі прадпрыемстваў і галін адказнасць за нарошчванне экспарту ўскладаецца на Міністэрства замежных спраў.

## Пра сельскую гаспадарку

“Вядома, стаўку мы рабілі і будзем рабіць на буйнатаварную вытворчасць, на фарміраванне скразных, добра арганізаваных прадуктовых кампаній, якія ахопліваюць усю інфраструктуру — ад вытворчасці зыходнай сельскагаспадарчай сыравіны да яе перапрацоўкі. А дадатковым рэзервам развіцця вёскі, які пакуль слаба выкарыстоўваецца, павінны стаць фермерства і прадпрымальніцтва”, — сказаў Прэзідэнт.

У фермерскіх гаспадарках краіны занята 9 тысяч чалавек: “Да 2020 года неабходна стварыць не менш за 3,5 тысячы новых працоўных месцаў і павялічыць вытворчасць прадукцыі ў фермерскіх гаспадарках у 3 разы”.

## Пра дзяржпраграмы

"У 2016-2020 гадах плануецца рэалізоўваць больш за 20 дзяржаўных праграм, пры гэтым арыенціровачна дзве трэці бюджэтных сродкаў, выдзеленых на іх фінансаванне, будуць інвеставаны ў сацыяльную сферу. У першую чаргу ў медыцыну, адукацыю, культуру, падтрымку сем'яў, сацыяльную абарону насельніцтва", — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ніводзін чалавек, які апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, не павінен застацца без дапамогі дзяржавы, адзначыў Прэзідэнт. Гаворка ідзе пра ўкараненне безнаяўных жыллёвых субсідый у мэтах змякчэння наступстваў павелічэння тарыфаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі: "Іх павелічэнне павінна праводзіцца адначасова са зніжэннем выдаткаў на аказанне паслуг, ростам даходаў людзей і развіццём сістэмы адраснай падтрымкі неабароненых катэгорый грамадзян".

## Пра здароўе

Усе ўстановы аховы здароўя павінны быць нацэлены перш за ўсё на ранняе дыягнаставанне і лячэнне максімальна шырокага спектра хвароб на якасна высокім узроўні, упэўнены Прэзідэнт: "Трэба павялічыць аб'ёмы высокатэхналагічных відаў медыцынскай дапамогі, та-



БЕЛТА

кіх як кардыя- і нейрахірургія, хірургічная афтальмалогія, транспланталогія, эндапратэзаванне, актыўна развіваць тэлемедыцыну, дыстанцыйныя формы маніторынгу здароўя".

Неабходна забяспечыць паэтапны пераход да дзейнасці ўчастковай службы па прынцыпе каманды: урач агульнай практыкі, яго памочнік па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе, медыцынская сястра: "Да 2020 года трэба павялічыць долю працуючых па гэтым прынцыпе да 100 працэнтаў".

Для папулярызацыі моды на здароўе неабходна актыўна выкарыстоўваць таксама фізкультуру і спорт. Трэба накіраваць фізкультурна-масавую работу на павелічэнне аздараўленчых груп, клубаў па інтарэсах, секцый па відах спорту.

## Пра адукацыю

Сістэма адукацыі не павінна быць адарванай ад эканомікі, упэўнены Прэзідэнт: "Трэба павялічваць практыка-арыентаванасць навучання. Гэта адзіны шлях падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць інфармацыйнымі тэхналогіямі, якія ведаюць усе этапы вытворчасці. Ідэя бесперапыннай адукацыі, зразумела, не азначае, што чалавек усё жыццё будзе студэнтам. Гаворка ідзе пра адукацыю, якая фарміруе ў чалавеку імкненне да пастаяннага ўдасканалення і самаразвіцця".

Гаворачы пра некаторыя аспекты школьнай праграмы, Прэзідэнт сказаў, што тут не месца "мудрагелістым падручнікам". Менавіта таму перад Міністэрствам адукацыі пастаўлена задача ў бліжэйшы час стварыць новыя падручнікі: "І іх павінны стварыць лепшыя настаўнікі рэспублікі. Нельга дзяцей перагружаць з малога ўзросту".

## Пра культуру

"Беларусь сёння — гэта цытадэль традыцыйнай культуры і маралі. Так будзе заўсёды! — упэўнены Прэзідэнт. — Трэба культурным работнікам быць больш ініцыятыўнымі, раскаванымі і не глядзець увесь час у рот дзяржаве. Акцэнт трэба зрабіць як на маштабах і якасным боку нашай культурнай сферы, так і на павышэнні яе турыстычнай прывабнасці".

Ствараемыя творы літаратуры, музычнага, выяўленчага, тэатральнага і кінамастацтва прызначаны садзейнічаць фарміраванню каштоўнасцяў беларускага грамадства, адлюстроўваць духоўны досвед нацыі.

## Пра парламенцкія выбары

Ва ўяўленні Аляксандра Лукашэнкі дэпутаты — гэта прафесійныя, кампетэнтныя грамадзяне, якія маюць досвед паспяховай работы ў той ці іншай сферы і здольныя вырашаць задачы, якія стаяць перад грамадствам. Яны сумленныя, прыстойныя і ўмеюць трымаць слова, у іх няма фанабэрыі і ганарыстасці. У прэтэндэнта на месца ў Парламенце павінна быць канструктыўная праграма дзеянняў у якасці дэпутата, ён павінен умець бачыць перспектыву, вылучаць галоўнае і істотнае ў чарзе будзённых з'яў, быць адданым сваёй дзяржаве і народу: "Прама скажу: менавіта такіх людзей я хацеў бы бачыць у новым складзе Парламента. Адказныя перад імі будуць стаяць задачы: па ўдасканаленні прававой базы, развіцці супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, умацаванні пазіцый Беларусі на міжнароднай арэне".

## Пра будаўніцтва

За пяцігодку ў краіне плануецца пабудаваць звыш 18 мільёнаў квадратных метраў жылля, у тым ліку 1,55 мільёна — для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу. За апошнія пяць гадоў у Беларусі пабудавана больш за 25 мільёнаў квадратных метраў жылля. Эфектыўнасць будаўнічай галіны неабходна павялічваць за кошт пераходу на новыя тэхналогіі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння ставіцца задача пераарыентацыі магутнасцяў галіны на экспарт паслуг — праектаванне і здачу аб'ектаў пад ключ. Таксама больш актыўна будзе развівацца індывідуальнае будаўніцтва.

## Слова дэлегату



**Васіль Равяка, кіраўнік СВК "Прагрэс-Верцялішкі" Гродзенскага раёна:**

*— Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны пастаўлена задача зніжэння сабекошту прадукцыі не менш як на 25 працэнтаў. Вельмі правільная мэта. Працуючы ў гэтым напрамку, мы захоўваем канкурэнтаздольнасць на знешніх рынках. Гэта дае магчымасць таксама праводзіць больш гібкую цэнавую палітыку. Адным з прыярытэтаў для нас з'яўляецца адыход ад імпартнай тэхнікі на карысць айчынных машын і механізмаў, што дасць магчымасць значна скараціць затраты на рамонт і набыццё запасных частак.*



**Сямён Шапіра, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*— Мы выбралі свой шлях. І вось вынік: за мінулыя 20 гадоў незалежная Беларусь забяспечыла высокі ўзровень якасці жыцця сваіх грамадзян. А беларускі народ праявіў сапраўды гістарычную мудрасць на выбарах першага Кіраўніка сваёй незалежнай дзяржавы.*

*У аснове істотных дасягненняў Мінішчыны — фарміраванне моцнай каманды маладых прафесіяналаў. Мы іх знаходзім і гадуем. Сярэдні ўзрост назначаных у апошнія гады кіраўнікоў гаспадарак — меншы за 30 гадоў. А старшыняў выканкамаў — каля 35. І за імі будучыня.*



**Валерый Губарэнка, старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі ветэранаў Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў:**

*— Нам пашчасціла жыць у краіне, галоўнымі дасягненнямі якой з'яўляюцца мір і незалежнасць. Менавіта таму не вязуць у цынкавых трунах нашых сыноў з гарачых пунктаў планеты. Аднак такая сітуацыя ў свеце не ўсюды. Шэраг дзяржаў уцягнуты ў ваенныя дзеянні. Ветэраны Брэстчыны, як і ўсе жыхары Беларусі, занепакоеныя геапалітычнай сітуацыяй. Але мы не сумняваемся, што ў нашай краіне ёсць усё неабходнае, каб надзейна захаваць стабільнасць і бяспеку. Наша армія аснашчана сучаснай тэхнікай і зброяй і здольная даць адпор любому агрэсару.*

*Напрыканцы пажаданне: уключыць у праграму навучальных устаноў вывучэнне матэрыялаў Брэсцкай крэпасці і музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.*



**Леанід Пянькоўскі, старшыня Бешанковіцкага райвыканкама:**

*— У новай пяцігодцы вельмі важна не толькі захаваць дасягнуты ўзровень, але і забяспечыць далейшае нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці з адначасовым павышэннем якасці і прадукцыйнасці працы. Аднак выканаць пастаўленыя задачы будзе складана без далейшай падтрымкі аграрнага сектара з боку дзяржавы ў выглядзе льготных крэдытаў, надбавак за выробленую прадукцыю, паставак лізінгавай тэхнікі. Лічу неабходным больш увагі надаць развіццю фермерскіх гаспадарак, асабліва ў такіх галінах, як авечкагадоўля, трусагадоўля, звераргадоўля. Усе магчымасці для гэтага ёсць. Важна адзначыць, што ў Бешанковічах да канца года запланаваны ўвод у эксплуатацыю сучаснага завода медпрэпаратаў, якія прымяняюцца пры лячэнні анкалагічных ды іншых цяжкіх захворванняў. Выпушчаная прадукцыя будзе насіць імпартазамяшчальны характар і арыентавана на экспарт.*



**Святлана Сарока, дырэктар Палаца культуры г. Маладзечна, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*— Сёлета статус культурнай сталіцы Беларусі атрымаў мой родны горад Маладзечна. Нацыя без культуры не можа быць багатай. На бліжэйшую пяцігодку ў работнікаў культуры маштабныя планы. Мы ў Савеце Рэспублікі разам з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і Урадам працуем над кодэксам аб культуры. Гэты дакумент адкрые шырокія перспектывы для прыцягнення ў сферу культуры інвестыцый на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства, развіцця традыцый мецэнацтва.*



**Ірына Шабулдаева, маляр Гомельскага домабудаўнічага камбіната:**

*— Мы, будаўнікі, гатовыя працаваць больш плённа і больш дабрасумленна. Але апошнія навіны пра магчымае скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля з падтрымкай дзяржавы турбуюць і нашу брыгаду. Камерцыйнае будаўніцтва жылля на дадзеным этапе не зможа перакрыць памяншаемыя аб'ёмы. Трэба звярнуць на гэта асаблівую ўвагу. Можа быць, варта развіць новыя формы фінансавання і падтрымкі грамадзян. Тады ў большай колькасці людзей з'явіцца шанц палепшыць жыллёвыя ўмовы, а ў нас — работа. І не толькі ў нас, будаўнікоў, але і ў іншых галінах эканомікі. Бо будаўніцтва заўсёды было яе лакаматывам.*

*Неабходна таксама максімальна наблізіць вучобу да рэальнага жыцця, павысіць прэстыж рабочых спецыяльнасцяў. У будаўніцтва павінны прыходзіць маладыя людзі. Не тыя, хто не паступіў у ВНУ або каледж, а тыя, хто ўсвядомлена выбраў прафесію.*




БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка:

***Форум з усёй відавочнасцю паказаў, што народаўладдзе з’яўляецца важнейшым інструментам прыняцця лёсавызначальных рашэнняў у Беларусі***

# Заўтрашні дзень бачыцца канкрэтна

**22 і 23 чэрвеня Палац Рэспублікі быў цэнтрам грамадска-палітычнага жыцця краіны. І яе эканамічным штабам. Тут звяралі гадзіннікі, абмяркоўваючы праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016-2020 гады, 2,5 тысячы дэлегатаў пятага Усебеларускага народнага сходу.**

На форуме сабраліся прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства. Дэлегатамі сталі не толькі кіраўнікі, дэпутаты, прадстаўнікі аб’яднанняў і партый. Права прадстаўляць народ на высокім сходзе атрымалі таксама шматлікія рабочыя і ваеннаслужачыя, працаўнікі сяла. Акрамя таго, прадпрымальнікі, студэнты, пенсіянеры. Прысутнічалі дыпламаты і замежныя госці. Большую частку выступленняў дэлегатаў складалі дакладныя прапановы па вырашэнні канкрэтных праблем. Прапанова старшыні Мінскага аблвыканкама Сямёна Шапіры:

— Нацбанку і Ураду варта выпрацаваць такую грашова-крэдытную палітыку, якая садзейнічала б прыцягненню капіталу не на дэпазіты банкаў, а ў народнагаспадарчы комплекс. Неабходна спыніць перапампоўванне рэсурсаў з эканомікі прадпрыемстваў праз банкі да пэўнага кола асоб, якое укладвае сёння грошы ў дэпазіты.

Гендырэктар Мінскага трактарнага завода Фёдар Дамаценка нагадаў, што ў бягучым годзе МТЗ споўнілася 70 гадоў. За гэты перыяд выраблена каля 4 мільёнаў адзінак тэхнікі, за мяжу — больш як у 120 краін — пастаўлена каля 3 мільёнаў адзінак. Кожны дзясяты акучвальны ўніверсальны трактар на планеце нясе марку “Беларус”.

Гродзенскі прадпрымальнік, кіраўнік кампаніі “Контэ Спа” Валянцін Байко асабістым паспяховым прыкладам аспрэчыў заявы скептыкаў, якія разносяцца часам пра тое, што бізнес у нашай краіне — занятак няўдзячны. Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Міхаіл Орда гаварыў пра абарону інтарэсаў чалавека працы ў няпросты эканамічны перыяд, а галоўны рэдактар выдавецкага холдынга “Звязда” Аляксандр Карлюкевіч — пра ролю СМІ ў жыцці грамадства.

Прэзідэнт, які прысутнічаў усе дні работы Усебеларускага народнага сходу, уважліва выслухаў кожнага дэлегата. Нярэдка даючы тут жа тлумачэнні або агучваючы ўласную пазіцыю па выкладзеным. Аляксандр Лукашэнка паведаміў: цэлы шэраг найбольш праблемных рэчаў ім ужо занатаваны. Прэзідэнт падтрымаў прапановы дэлегатаў палепшыць сістэму прафадукцыі, разгледзець пытанні крэдытавання эканомікі і ўкаранення ў грамадскую свядомасць здаровага ладу жыцця. Шмат пытанняў узнімалася ў сферы падрыхтоўкі кадраў. Прэзідэнт выказаў выразна свой пункт погляду: “Тут можна і

пакутаваць, і стагнаць, але вучыць кадры трэба на месцы. Ні адна ВНУ, прафтэхвучылішча, каледж, ліцэй не падрыхтуюць кадры так, як хацелася б. Усё роўна, і гэта ёсць ва ўсіх краінах, іх давучваюць, даводзяць да адпаведнага ўзроўню".

Аляксандр Лукашэнка даручыў усе пытанні, якія паступілі на гарачую лінію Усебеларускага народнага сходу, уважліва прааналізаваць і даць на іх адказы. А ў заключным слове падагульніў:

— Форум з усёй відавочнасцю паказаў, што народаўладдзе з'яўляецца важнейшым інструментам прыняцця лёсавызначальных рашэнняў у Беларусі. Мне вельмі спадабаліся вашы дзелавы настрой на работу і адначасова нязмушаная дружалюбная атмасфера сходу. Намі зацверджана доўгатэрміновая стратэгія развіцця краіны, прыняты праграмныя дакументы на наступныя пяць гадоў, выпрацаваны асноўныя напрамкі інавацыйнага абнаўлення краіны, мадэрнізацыі эканомікі з улікам новых сусветных тэндэнцый.

Прэзідэнт падзякаваў усім адказным за арганізацыю і правядзенне форуму. У завяршэнне форуму капітан 1 ранга былы падводнік Мікалай Ягораў у кулуарах Палаца Рэспублікі сказаў:

— Ведаеце, я прайшоў 4 акіяны, 25 мораў. Словам, пабачыў і зведаў многае. Але ад Усебеларускага народнага сходу, ад пачутага на ім проста ў захапленні. Бачу, што цяперашнія цяжкасці мы абавязкова перажывём. Толькі падцісне рамяні, як гаворыцца, на час. Марская практыка паказвае: любая стыхія рана ці позна заканчваецца. Адыдуць і ўсе праблемы.

Тая ж думка гучыць і ў звароце ўдзельнікаў пятага Усебеларускага народнага сходу: "Мы моцны духам народ і справімся з любымі цяжкасцямі на шляху да мэт дынамічнага развіцця нашай любімай Беларусі".

У рэзалюцыі пятага Усебеларускага народнага сходу ключавой задачай на бліжэйшае пяцігоддзе абазначана аднаўленне і забеспячэнне далейшага ўстойлівага эканамічнага росту як асновы для паспяховага жыцця будучых пакаленняў. Рэзалюцыя будзе перададзена Прэзідэнту для разгляду і прыняцця неабходных рашэнняў.

Уладзімір **Хромаў**

## Меркаванні экспертаў



**Георгій Грыц, намеснік старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:**

*— Выступленне Кіраўніка дзяржавы было традыцыйна стратэгічным і даволі ёмістым. У той жа час мне здалося, што яно мела істотныя адрозненні ад папярэдніх выступленняў. Гэта своеасаблівая дарожная карта для ўсёй краіны. Калі разбіць выступленне на цытаты, то іх можна разглядаць як дапаможнік да дзеяння. Вядома, пры рэалізацыі такіх амбіцыйных задач, якія стаяць перад краінай, неабходная кансалідацыя і грамадства, і бізнесу, і ўлады. І без адзіных мэт і крытэрыяў да кіраўнікоў, якія будуць іх дасягаць, дамагчыся гэтай кансалідацыі немагчыма.*



**Канстанцін Шабека, доктар эканамічных навук:**

*— Сёння чалавецтва, і Беларусь у тым ліку, знаходзіцца перад тварам вельмі сур'ёзнага выкліку — глабальнага тэхналагічнага пераходу. Не ўсе гэта яшчэ разумеюць, але, увогуле, мы ўжо жывём у новай рэальнасці. У гэтай сітуацыі ў нас, уласна, ёсць два варыянты: або мы як краіна знаходзім годны адказ на гэты выклік і тады будзем у ліку тых, хто пераходзіць на наступны этап, або страчваем свой шанц. Гэта і ёсць цана пытання, і тое, што мы абмяркоўвалі ў тым ліку на гэтым форуме, прыярытэты, якія былі выказаны (і ў адукацыі, і ў цэлым па эканоміцы), — гэта наш адказ на выклік.*

*Цяпер самае важнае — рэалізацыя парадку. А гэта залежыць ад таго, наколькі мы ўсе будзем актыўна і эфектыўна ўдзельнічаць у працэсе.*



**Анатоль Башмакоў, доктар эканамічных навук:**

*— Сёння Беларусь, Казахстан і Расія складаюць ядро такога маштабнага эканамічнага ўтварэння, як ЕАЭС. Разам у нас ёсць каласальныя магчымасці. Але ў цяперашні час вельмі важна, каб эканамічнае супрацоўніцтва напаўнялася яшчэ і гуманітарным зместам. Мы ўсё-такі вельмі блізкія ў гістарычным, ментальным, маральным планах.*



**Таццяна Садоўская, кандыдат эканамічных навук:**

*— Важна не ператвараць аплату працы ў простую сацыяльную выплату, якая не залежыць ад унёску работніка. Неабходныя няўхільная рэалізацыя абавязацельстваў дзяржавы ў сферы сацыяльных мэт, дасягненне большай сацыяльнай роўнасці, справядлівасці і дабрабыту. Сістэмы аховы здароўя, адукацыі, культуры і сацыяльнай падтрымкі павінны выбудоўвацца вакол сям'і і асобных грамадзян. Адначасова неабходна культываваць у грамадстве палажэнне аб тым, што дзяржава — не донар, а партнёр, які стварае ўмовы для дабрабыту грамадзян. Стратэгія дзяржавы павінна будавацца ў напрамку ад сацыяльнай абароны да сацыяльнага прагрэсу.*



**Аляксандр Муха, аналітык:**

*— Неабходна падкрэсліць важнасць фінансавай стабільнасці. Мы прадпрымаем захады па зніжэнні інфляцыі, і на будучую пяцігодку гэта стратэгічны напрамак: да 2020 года плануецца выйсці на ўзровень не большы за 5 працэнтаў у год. Аб'ём грошай у эканоміцы павінен адпавядаць аб'ёму рынку тавараў і паслуг. Пры гэтым нізкая і прадказальная інфляцыя адпавядае інтарэсам усіх суб'ектаў нацыянальнай эканомікі — і прадпрыемстваў, і насельніцтва, і дзяржавы. А таксама інтарэсам замежных інвестараў, якія будуць актыўней укладваць грошы ў нашу краіну.*

# Краіна і мір зрабіліся сінонімамі

## Беларусь адыгрывае важную ролю ў захаванні стабільнасці ў рэгіёне

Глабальная эканамічная турбулентнасць і геапалітычныя штормы, якія ўзнікаюць час ад часу, мімаволі прымушаюць задумацца пра тое, як выстаяць нам у гэтай рэальнасці, захаваць краіну і ўмацаваць яе незалежнасць. Менавіта таму на Усебеларускім народным сходзе вельмі важна было прааналізаваць тэндэнцыі сусветнай палітыкі і дакладна вызначыць асноўныя прыярытэты знешнепалітычнай стратэгіі Беларусі.

За мінулыя пяць гадоў свет вакол нас значна змяніўся. Але нязменнымі засталіся нашы прынцыпы і абавязацельствы перад партнёрамі. Мы не кідаліся ў сваіх перавагах, нікому не здраджвалі, ні да кога не паддобрываліся, адкрыта і сумленна фармулявалі сваю пазіцыю з міжнародных трыбун, выступаючы за справядлівы светапарадак. І пры гэтым, вядома ж, не забывалі пра свае нацыянальныя інтарэсы. Такую прынцыповасць па заслугах ацанілі ў сусветнай супольнасці. Невыпадкова Мінск быў вылучаны ў якасці пляцоўкі для перагавораў па сітуацыі ва Украіне. Менавіта тут, у цэнтры Еўропы, у лютым 2015 года пасля напружанага 16-гадзіннага дыпламатычнага марафона лідары “нармандскай чацвёркі” Пуцін, Парашэнка, Меркель і Аланд падпісалі Дэкларацыю, якая заклала аснову для дээскалацыі канфлікту ва Украіне. Ролю Беларусі ў гэтым працэсе доктар палітычных навук Сяргей Кізіма ацаніў так:

— Беларусь першая забіла ў званы, першая адзначыла маштаб будучай



БЕЛТА

*За мінулыя пяць гадоў свет вакол нас значна змяніўся. Але нязменнымі засталіся нашы прынцыпы і абавязацельствы перад партнёрамі*

катастрофы, першая прапанавала рэалістычныя планы, як замарозіць ці спыніць гэты канфлікт.

У выніку тэрмін “Мінскія пагадненні” трывала ўвайшоў у лексікон палітыкаў, а словы “Мінск” і “мір” сталі сінонімамі. Міратворчыя намаганні нашай краіны кардынальна змянілі яе ўспрыманне на Захадзе, лічыць нямецкі палітолаг Рэйнхольд Крум:

— Зняцце санкцый з палітычнай эліты Беларусі — гэта крок у бок дзелавога супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю. У Еўрасаюзе яшчэ раз убачылі ў Мінску партнёра, які

спрабуе ўрэгуляваць адносіны паміж Захадам і Усходам. І гэта ў дадатак да таго, што нават у перыяд “замарозкі” адносінаў Захад не спыняў супрацоўніцтва з Беларуссю ў такіх значных сферах, як сумеснае добраўпарадкаванне мяжы, барацьба з наркатрафікам і трансгранічнай злачыннасцю. Еўрасаюз ніколі не сумняваўся, што яго межы на ўсходзе надзейна абароненыя. Галоўная задача на бліжэйшыя гады — матэрыялізаваць тэндэнцыю паляпшэння адносінаў з Захадам, ператварыць яе ў канкрэтныя праекты, пачынаючы ад гандлю ды інвестыцый і заканчваючы спрашчэннем візавага рэжыму.

Папярэднія пяць гадоў не прайшлі дарэмна і на ўсходнім напрамку. Мы ўвайшлі ў склад Еўразійскага эканамічнага саюза, адкрылі для сябе новыя рынкі ў краінах “далёкай дугі” і здзейснілі сапраўдны прарыў у адносінах з такім гігантам, як Кітай. Прыклад таму — пачатак будаўніцтва высокатэхналагічнага Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку “Вялікі камень” і падключэнне Беларусі да такога амбіцыйнага праекта, як Эканамічны пояс Вялікага шаўковага шляху. На гэтай магістралі Мінску адводзіцца гістарычная роля эканамічнага, гандлёвага і лагістычнага скрыжавання паміж Захадам і Усходам. Гучыць, быць можа, пафасна, але так яно і ёсць. Магутны Кітай, з’яўляючыся другой эканомікай свету, убачыў у нашай краіне надзейнага і перспектыўнага партнёра. Гэты факт стаў яшчэ адным пацверджаннем таго, што за гады незалежнасці Беларусь ператварылася ў значнага гульца рэгіянальнай палітыкі, гаворыць кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін:

— У сучасным свеце, заснаваным на надзвычай жорсткай канкурэнцыі не толькі паміж дзяржавамі, але і паміж транснацыянальнымі карпарацыямі, на імкненні транснацыянальнага капіталу навязаць сваю волю народам і дзяржавам, выстаяць можна, толькі рэалізуючы інтэграцыйную парадыгму развіцця і ствараючы шматпалярны светапарадак. Беларусь у гэтым плане выступае цудоўнай ілюстрацыяй краіны, для якой патрэба супрацоўнічаць пераўзыходзіць імкненне канкурыраваць.

Уладзімір **Веліхаў**



БЕЛТА

# Пытанне — адказ

**Падчас работы Усебеларускага народнага сходу была разгорнута гарачая лінія, на якую мог патэлефанаваць любы жадаючы і выказаць свае прапановы наконт сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны**

Яшчэ падчас форуму была агучана статыстыка званкоў. Паводле слоў Старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі, да канца другога дня работы Усебеларускага народнага сходу на лінію паступіла больш за 420 зваротаў грамадзян. Большасць з іх закранала сферы ЖКГ і будаўніцтва, аднак многія датычыліся сацыяльнай палітыкі і працоўных адносінаў. У.Андрэйчанка адзначыў важны момант: званкі паступалі не толькі з праблемнымі пытаннямі, аператары нярэдка прымалі і словы падзякі ў адрас розных арганізацый у сувязі з ужо аказанай дапамогай.

— Грамадзяне ўздымалі праблемы прафарыентацыі школьнікаў, укаранення электроннай школы, выдзялення жылля для воінаў-інтэрнацыяналістаў, арганізацыі нацыянальных суботнікаў па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый, стымулявання культуры збору другсыравіны, распрацоўкі і выкарыстання экалагічнай упакоўкі для прадуктаў харчавання, — пералічыў Уладзімір Андрэйчанка. — Паступіла таксама цікавая прапанова аб стварэнні пры Прэзідэнце савета маладых навукоўцаў-практыкаў, які б генерыраваў ідэі і прапановы ў розных сферах эканомікі.

Сярод званкоў былі просьбы, у выкананні якіх адмовіць будзе цяжка. Напрыклад, на гарачую лінію дазваніўся малады чалавек, у якога дыягнаставалі цяжкую хваробу — артроз тазасцегнавага сустава. Вылечыць яго магчыма, але пры дапамозе ствалавых клетак. Нягледзячы на тое, што ў нашай краіне такія медыцынскія тэхналогіі ўжо з’яўляюцца, пакуль дапамагчы з бядой яму не змаглі. Патрэбна дарагая аперацыя ў адной з суседніх дзяржаў. У дадзеным выпадку выснова напрошваецца адна: сам-насам з бядой просьбіта не пакінуць.

Таксама атрымае дапамогу, дакладней, магчымасць выходзіць з кватэры Н., інвалід-калясачнік з Мінска. Адсутнасць ля пад’езда дома пандуса зрабіла яго жыццё амаль невыносным. Упэўнены, што камфортны і зручны з’езд абавязкова з’явіцца, а разам з ім і магчымасць ажыццяўляць прагулкі.

У сучасны момант усе пытанні і звароты грамадзян адпаведным чынам апрацоўваюцца, і некаторыя з іх знойдуць сваё адлюстраванне ў выніковых праграмных дакументах Усебеларускага народнага сходу. У любым выпадку заяўнікі атрымаюць на рукі падрабязныя адказы.

Вольга **Карнеева**

# “Дарожная карта” актыўных дзеянняў

## У Ташкенце прайшоў саміт кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Гэта быў першы саміт ШАС, дзе Беларусь прымала ўдзел на вышэйшым узроўні ў новым статусе назіральніка.

У рабоце саміту прыняў удзел Прэзідэнт Беларусі. Год назад краіна атрымала статус назіральніка пры гэтым міждзяржаўным аб’яднанні. З высокай трыбуны саміту Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў калег аб бачанні Мінскам свайго ўдзелу ў сумеснай рабоце.

Паводле слоў Прэзідэнта, імкненне беларускага боку да актыўнага ўдзелу ў рабоце арганізацыі тлумачыцца важнай роляй, якую ШАС адыгрывае ў вырашэнні сусветных і рэгіянальных пытанняў, а таксама тым фактам, што ў гэтае інтэграцыйнае ўтварэнне ўваходзяць шчырыя сябры Беларусі.

У цяперашні час шэсць краін з’яўляюцца дзяржавамі — членамі заснаванай у 2001 годзе Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва — Казахстан, Кітай, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан і Узбекістан. Шэсць краін маюць статус дзяржавы-назіральніка пры ШАС — Афганістан, Беларусь, Індыя, Іран, Манголія і Пакістан. Адносна Індыі і Пакістана кіраўнікі дзяржаў ШАС у ліпені 2015 года на Уфімскім саміце прынялі рашэнне аб пачатку працэдуры іх прыёму ў ШАС. У перспектыве на членства ў арганізацыі прэтэндуе Іран.

Шэсць краін з’яўляюцца партнёрамі па дыялогу ШАС — Азербайджан, Арменія, Камбоджа, Непал, Турцыя і Шры-Ланка.

Першапачаткова задачы ШАС ляжалі ў сферы ўзаемных унутрырэгіянальных дзеянняў па спыненні тэрарыстычных актаў, сепаратызму і экстрэмізму ў Сярэдняй Азіі. Аднак па меры развіцця арганізацыі пытанні



БЕЛТА

бяспекі былі дапоўнены эканамічным блокам, уключаючы энергетыку, транспарт, АПК, тэлекамунікацыі, а таксама гуманітарным вымярэннем ШАС. Дзяржавы-члены таксама актыўна ўзаемадзейнічаюць у навукова-тэхнічнай, культурнай, адукацыйнай і турыстычнай сферах.

На думку Прэзідэнта Беларусі, эканамічная кааперацыя павінна стаць магістральным напрамкам узаемадзеяння ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва: “У рамках ШАС акумуляваны каласальны эканамічны патэнцыял. Да таго ж з уваходжаннем у арганізацыю такіх краін, як Індыя і Пакістан, яе маштабы яшчэ больш узрастуць”.

Беларусь цалкам падзяляе падыходы ШАС да забеспячэння міжнароднай

**Даслоўна**

### З выступлення Прэзідэнта Беларусі на саміце кіраўнікоў дзяржаў ШАС:

*— Развіццю супрацоўніцтва з азіяцкім рэгіёнам Беларусь надае важнейшае палітычнае і эканамічнае значэнне. Мы цалкам падтрымліваем выбудоўванне новай архітэктуры адносінаў на прасторы Еўразіі з улікам інтарэсаў усіх дзяржаў кантынента... Як краіна-назіральнік у ШАС мы не збіраемся, кажучы спартыўнай тэрміналогіяй, сачыць за гульнёй з “лаўкі запасных”. Беларусь гатовая стаць актыўным “палявым іграком” на прасторы арганізацыі і ўносіць важкі ўклад у яе работу на карысць нашых народаў.*





БЕЛТА

бяспекі. "Вы добра ведаеце пра міралюбнасць і шматвектарнасць знешняй палітыкі Беларусі, якая нацэлена на захаванне стабільнасці і спакою ў нашым рэгіёне, — заявіў Прэзідэнт. — Сёння, калі ў свеце расце нестабільнасць і множыцца колькасць рэгіянальных канфліктаў, асабліва важныя з'яднанасць дзяржаў і імкненне дзейнічаць адзіным фронтам у вырашэнні глабальных праблем".

Кіраўнік беларускай дзяржавы перакананы, што ШАС з'яўляецца запатрабаванай перагаворнай пляцоўкай для калектыўнай выпрацоўкі механізмаў процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам. "Першараднае значэнне мае аб'яднанне намаганняў для ліквідацыі розных формаў і праяў тэрарызму, экстрэмізму, арганізаванай злачыннасці і наркатрафіку, папярэджання надзвычайных сітуацый і канфліктаў", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У лік важных арыенціраў фарміравання эканамічнай палітыкі ШАС павінна ўвайсці ўзаемадзеянне з Еўразійскім эканамічным саюзам. Такое меркаванне таксама выказаў Прэзідэнт Беларусі, выступаючы на саміце кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Ташкенце. "Пакуль гэтая тэма не вельмі акрэслена ў рамках ШАС", — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, у бакоў нямала і іншых агульных інтарэсаў. У прыватнасці, Беларусь падтрымала маштабную ініцыятыву Старшыні КНР Сі Цзіньпіна аб стварэнні Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. "Будуючы Кітайска-беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень", мы на справе дэманструем гатоўнасць стаць адным з ключавых сувязных звёнаў гэтага грандыёзнага плана", — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Валодаючы сур'ёзным прамысловым, навуковым і інавацыйным патэнцыялам, Беларусь заўсёды мае магчымасць паўдзельнічаць ва ўзаемавыгадных інфраструктурных праектах, якія будуць ажыццяўляцца або ажыццяўляюцца на пляцоўцы ШАС, у тым ліку ў сферы транспарту, лагістыкі, энергетыкі. "Займаючы лідзіруючыя пазіцыі ў сферы забеспячэння харчовай бяспекі, мы згодны падзяліцца сваімі напрацоўкамі і ў гэтым напрамку, — сказаў Прэзідэнт. — Наша краіна таксама поўнасцю адкрытая для ўзаемадзеяння ў сферы прамысловасці, навукі, адукацыі, турызму і гуманітарнага супрацоўніцтва".

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўвесь гэты патэнцыял будзе запатрабаваны пры распрацоўцы перспектыўных планаў і праектаў у фармаце ШАС.

Шматбаковы саміт — гэта заўсёды зручнае месца і для зацікаўленых двухбаковых сустрэч. Першая з такіх сустрэч у Прэзідэнта Беларусі прайшла са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам. Варта адзначыць, што менавіта пры актыўнай падтрымцы Пекіна Мінск атрымаў статус назіральніка ў ШАС.

Аляксандр Лукашэнка шчыра падзякаваў кіраўніку Кітая за гэта. Запэўніўшы, што Беларусь у поўнай меры гатовая ісці па шляху паглыблення адносінаў з КНР і Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва.

— Мы гатовыя быць заходнімі варотамі гэтай арганізацыі, — сказаў Прэзідэнт.

Сі Цзіньпін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з паспяховым правядзеннем пятага Усебеларускага народнага сходу.

— Упэўнены, што пад вашым кіраўніцтвам у Беларусі будуць дасягнуты новыя поспехі, — сказаў Старшыня КНР і запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Кітай з дзяржаўным візітам.

Пра тое, каб надаць вялікую дынаміку міждзяржаўнаму ўзаемадзеянню, ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндра Модзі. Эканамічны арыенцір супрацоўніцтва быў абазначаны падчас візіту ў Мінск Прэзідэнта Індыі Пранаба Мукерджы ў чэрвені мінулага года — дасягнуць мільярда долараў узаемнага тавараабароту.

— Пад гэты мільярд нам трэба стварыць нейкую эканамічную "дарожную карту", каб дасягнуць гэтага рубяжа, — гэтую прапанову Аляксандра Лукашэнкі Нарэндра Модзі сустрэў з вялікай зацікаўленасцю.

Прэзідэнт Беларусі назваў эканамічную кааперацыю магістральным напрамкам узаемадзеяння краін ШАС. Гэта заканамерна. Дарэчы, дзяржавы — члены арганізацыі, назіральнікі і партнёры па дыялогу аб'ядноўваюць каля 45 працэнтаў насельніцтва планеты.

А Мінск выступае за рэалізацыю цэлага шэрага сумесных маштабных праектаў. У іх ліку, напрыклад, заснаванне фінансавага інстытута ШАС, які садзейнічаў бы стварэнню механізму ўзаемаразлікаў паміж краінамі ў нацыянальных валютах.

Васіль **Харытонаў**

# У карэце мінулага далёка не паедзеш

## Штогод аўтапарк краіны дынамічна папаўняецца — сёння па гарадскіх вуліцах і загараднай шашы бегае больш за 4 мільёны адзінак усіх відаў транспартных сродкаў

Нагадзіцеся, нямала. І ўся гэтая армада пакідае за сабою шлейф са шматлікіх шкодных злучэнняў — больш за 90 кілаграмаў у год на кожнага з нас. Праўда, у апошнія гады колькасць шкодных выкідаў ад гэтай крыніцы забруджванняў скарачаецца. Паводле слоў загадчыка аддзела аховы працы і экалогіі БелНДІТ "Транстэхніка" Сяргея Навасёлава, з 2010 па 2014 год іх аб'ём знізіўся на 6,5 працэнта, да 881 тысячы тон. За кошт чаго гэта стала магчымым пры растучым парку? На рынак прыйшлі аўтамабілі з больш экалагічнымі рухавікамі. "Наша прамысловасць працуе на экалагічнасць, — гаворыць Сяргей Навасёлаў. — Прадпрыемствы выпускаюць аўтобусы ў асноўным не ніжэйшыя за чацвёрты экалагічны клас — Еўра-4. Датычыцца гэта і паліва. Айчынны вытворца выпускае канкурэнтаздольны прадукт, які з задавальненнем купляюць за мяжой. Вельмі важна, што ў ім істотна паніжана ўтрыманне серы".

Але ўсё ж яны па-ранейшаму працуюць на традыцыйным паліве. Нетрадыцыйныя віды — прыродны газ, электраэнергія ды іншыя — пакуль робяць першыя крокі. Сёлета аўтапарк Мінска прырос дзясяткам аўтобусаў, якія працуюць на газе. Выкіды ад кожнага, гавораць эксперты, ніжэйшыя, чым у іх бензінавых сабратаў, напалову. Пра якія лічбы ідзе размова? Пры спальванні тысячы літраў вадкага нафтавага маторнага паліва ў паветра разам з адпрацаванымі газамі выкідваецца ад 180 да 300 кг аксіду вугляроду, ад 20 да 40 кг вуглевадародаў, ад 25 да 45 кг вокіслаў азоту. Вось і лічыце, наколькі істотная выгада. Але вось ці змагла ў поўнай меры адчуць яе гарадская атмасфера?

Не паспелі ўнесці свой уклад электробусы — яны пакуль затрымаліся на стадыі доследных узораў. Не, ёсць нейкая невялікая колькасць электракараў у прыватных руках, акрамя таго, нядаўна некалькі электробусаў прыехалі ў краіну па праекце міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да зялёнай эканомікі". А вось свае ўласныя дзве машыны мадэлі Е433 вытворчасці "Белкамунмаш" паедуць па вуліцах Мінска толькі ў канцы гэтага года. У наступным — яшчэ васямнаццаць.

Далей, вядома ж, іх будзе больш. Спецыялісты сцвярджаюць, што за гэтым відам транспарту — будучыня. Дарэчы, гэтым шляхам ідуць шматлікія нашы суседзі. Напрыклад, Літва, якая атрымала 30 мільёнаў еўра ад ЕС на развіццё электратранспарту. У Эстоніі, дзе такая праграма завершана, працуе тысяча электракараў і сто зарадных станцый. Без сумнення, мы не горшыя. Тым больш з будаўніцтвам АЭС пытанне электраэнергіі для такіх аўтамабіляў будзе вырашана. Паводле слоў начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення ДВА "Белэнерга" Вольгі Пруднікавай, на перспектыву прапрацоўваецца разгалінаваная сетка заправачных станцый па краіне. І стаўка робіцца не толькі на грамадскі, але і асабісты электратранспарт.



Пакуль усё гэта гучыць як фантастыка. Хоць прыкладна такое ж адчуванне было некалі са з'яўленнем першых мабільных тэл-







ефонаў, якімі сёння нікога не здзівіць. Магчыма, гадоў праз пяць тое ж самае можна будзе сказаць і пра электратранспарт. Пакуль і ў Кітаі, і ў ЕС, і ў Амерыцы лік ідзе ўсяго толькі на сотні тысяч. Гэта не так шмат. Многія краіны робяць электробусы цікавымі спажыўцу праз сістэму прэферэнцый — ільготы пры куплі машыны, бясплатныя паркоўкі, бясплатную зарадку. Плюс свая паласа руху, мінус экалагічны падатак. Пагадзіцеся, гучыць прывабна. Што ў нас? Пакуль абмяркоўваецца магчымасць бязмытнага ўвозу такога транспарту.

А вось вялікай перспектывы развіцця ў нас самага, напэўна, экалагічнага ў свеце транспартнага напрамку — веласіпеднага — няма. Так, веласіпедаў і веласіпедыстаў стала нашмат больш, чым, скажам, яшчэ пяць, а ўжо тым больш дзесяць гадоў назад. І ўсё ж пакуль на дзевяцімільённае насельніцтва прыпадае ўсяго каля паўтара мільёнаў веласіпедаў. “У нас яго разглядаюць больш як падлеткавы транспарт, — гаворыць Сяргей Навасёлаў, — таму ён, на жаль, у разлік не прымаецца”.

Шкодныя выкіды аўтамабільнага транспарту, забруджванне прылеглых да дарог тэрыторый, шумы — дарэчы, у вялікіх гарадах доля аўтатранспартных складае 60-80 працэнтаў ад усіх шумоў — усё гэта не робіць гарадскую атмасферу больш экалагічнай. Ці пад сілу адкарэкціраваць гэта інавацыйнаму транспарту? Магчыма, але ў перспектыве. А вось што рабіць з колькасцю машын, якая няўхільна расце?

Выхадам з сітуацыі, як гэта зрабілі, напрыклад, у Лондане, змагла б стаць разгрузка цэнтраў нашых буйных гарадоў. Так званы мадальны зрух. Перавод пасажырапатоку з асабістага на грамадскі транспарт. Што гэта азначае? Разгалінаваная сетка стаянак вакол горада, дзе аўтамабілісты маглі б пакінуць асабісты транспарт, каб камфортна перасесці на грамадскі. У Маскве, якая стаіць у пробках, сістэма ў прынцыпе ўжо працуе.

Ці гатовыя мы масава перасесці на аўтобусы і трамваі? Вялікае пытанне. Але ў ідэі ёсць значныя плюсы, гаворыць Сяргей Навасёлаў: “Расход энергіі пры руху ў аўтобусе на аднаго пасажыра ў пяць разоў меншы, чым калі б ён ехаў у асабістым аўто, на трамваі і ў метро — і зусім у дзесяць. Развіццё грамадскага і зялёнага транспарту (веласіпеднай інфраструктуры) вырашыць праблемы з чысцінёй паветра і пробкамі. Для гэтага няма неабходнасці будаваць новыя магістралі — і гэта пры ўзрастаючай колькасці аўтатранспарту!”

Вера **Арцем’ева**

*Дзве машыны мадэлі Е433 вытворчасці “Белкамунмаш” паедуць па вуліцах Мінска толькі ў канцы гэтага года. У наступным — яшчэ васямнаццаць*

# У вынаходніцтве важна не спазніцца



**Пагадзіцеся, мы прывыклі ўспрымаць сэнс слова “радыяцыя” негатыўна. Звязваем гэта, перш за ўсё, з наступствамі якой-небудзь тэхнагеннай катастрофы ці з аварыяй на атамнай станцыі. Нам, жыхарам Беларусі, якія спазналі сіндром Чарнобыля, цяжка неяк інакш успрымаць радыяцыю. Але ж ёсць ад яе — калі радыяцыя кіруемая і падкантрольная — вельмі эфектыўная карысць. Напрыклад, у медыцыне сёння часам цяжка абысціся без радыенукліднай дыягностыкі.**

Урач-радыёлаг Уладзімір Церахаў

Яна ўсё больш актыўна ўваходзіць у сучасную методыку лячэння як абавязковы атрыбут. Радыенуклідная дыягностыка ў сусветнай практыцы нават называецца ядзернай медыцынай. Утварылася яна яшчэ ў 1927 — выходзіць, 90 гадоў хутка адзначым. Але, нягледзячы на такі паважны ўзрост, у Беларусі гэта даволі новае звяно ў пастаноўцы дакладнага дыягназу для пацыентаў.

— Увогуле, яна дапаўняе многія іншыя метады. Бо спецыяліст, які імкнецца дапамагчы пацыенту, павінен кіравацца комплексам абследаванняў, якія атрымліваецца пры дыягностыцы захворванняў, — гаворыць урач-радыёлаг мінскага гарадскога цэнтра радыенукліднай дыягностыкі Уладзімір Церахаў. — Гэта і рэнтгенаўская камп’ютарная тамаграфія, і ядзерна-магнітны рэзананс, і ўльтрагукавыя метады даследавання. Але, калі браць радыенуклідное даследаванне, то яно можа адназначна “падказаць” спецыялісту, які абавязкова хоча дакапацца да ісціны, у правільнай пастаноўцы дыягназу, а потым і ў выбары лячэння.

Радыенуклідная дыягностыка — увогуле, неінвазіўны метад. Сёння ён вельмі шырока выкарыстоўваецца ў практычнай ахове здароўя многіх еўрапейскіх краін. Для даследавання, у прыватнасці, такой праблемы, як ішэмія міякарду. Менавіта для выяўлення зон скрытай ішэміі на ранніх стадыях, што дае магчымасць чалавеку ў далейшым пазбавіцца ад тых складаных метадаў лячэння, якія не толькі дарагія, але і не заўсёды бяспечныя.

— З эканамічнага пункту гледжання мы эканомім і не прымушаем хворага падвяргацца такому інвазіўнаму метаду абследавання, як каранараангіяграфія, — удакладняе Уладзімір Церахаў. — Мы атрымліваем дакладную інфармацыю ўжо на ранніх стадыях пра тыя ж ішэмічныя працэсы, што ў далейшым можа дапамагчы чалавеку ў тэрапеўтычным і хірургічным лячэнні, не звяртаючыся да нейкіх дадатковых экстрэмальных дыягнастычных умяшанняў. Гэта значыць, у практычнай ахове здароўя, у тэрапеўтычнай кардыялогіі, у прыватнасці, гэта методыка вельмі важная. Напрыклад, хворы абследуецца да пачатку першых прыкмет ішэміі. Праходзіць курс лячэння. Потым яшчэ раз праводзіцца даследаванне і ўжо ў дынаміцы вызначаецца, эфектыўнае лячэнне ці не. Такі паэтапны падыход у абследаванні і лячэнні кардыялагічных хворых можа дапамагчы пацыенту і ўрачу не звяртацца, што важна, да аператыўных умяшанняў. Таксама методыка радыенукліднай дыягностыкі дарэчная ў даследаванні перфузіі тканкі галаўнога мозгу пры парушэнні кровазвароту, пры інсультах. У краіне мы фактычна стаім на чале гэтай методыкі. У нашым цэнтры радыенукліднай дыягностыкі, якому ўжо пяць гадоў, мы актыўна ўкаранілі ў практыку аховы здароўя даследаванне перфузіі міякарду, даследаванне перфузіі галаўнога мозга, якое вельмі дапамагае неўролагам у пастаноўцы дыягназу, а супрацоўнікам Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра “Кардыялогія” пры аператыўным умяшанні на сасудах брахіяцэфальных артэрый. Мадыфікаваная і актыўна прымяняецца методыка па дыферэнцыяльнай дыягностыцы вазарэнальных і эсенцыйных форм гіпертэнзіі, або, як у народзе кажуць, пры ныручным ці няныручным ціску. За гэта калектыў ужо двойчы ўдастойваўся ўзнагароды ад Прэзідэнта Беларусі. Калектывам цэнтра выпушчана дзве манаграфіі па радыенукліднай дыягностыцы. Мы актыўна ўдзельнічаем у выкладчыцкай рабоце. У СССР спецыялістаў у гэтай галіне рыхтавала Масква, Санкт-Пецярбург і Кіеў. Пасля таго, як Саюз распаўся, нашы спецыялісты засталіся ўбаку. І падрыхтоўка кадраў сёння адна з наспелых праблем.

***— Якія бачацца перспектывы?***

— Будучыня — гэта ўкараненне гібрыдных тэхналогій. Гібрыдных апаратаў, якія сумяшчаюць у сабе аднафатонны эмісійны камп'ютарны тамограф, што звязана з радыенуклíднай дыягностыкай, і рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф, што звязана ўжо з рэнтгеналогіяй, — гаворыць Уладзімір Церахаў. — І вось гэты сімбіёз радыенукліднага і рэнтгенаўскага метадаў даследавання — два ў адным — дазваляе пацыентам паскараць працэс абследавання. Задачу радыенукліднай дыягностыкі я сфармуляваў бы так: маючы дадзеныя рэнтгенаўскай тамаграфіі, якая дазваляе візуалізаваць структуру органаў з адначасовым вывучэннем функцыянальнага стану і асаблівасцяў работы органаў і сістэм, якую нам дае аднафатонны эмісійны тамограф, атрымліваць дакладную і іх ёсць ідэя сумясціць тры ў адным: ядзерны магнітны рэзананс, рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф і аднафатонны эмісійны камп'ютарны тамограф. Гэта будзе машына, якая дасць магчымасць абследаваць чалавека нават на малекулярным субклетачным узроўні. І ў нашай краіне таксама павінны ісці гэтым шляхам. Мы пакуль у гэтай справе — у авангардзе.

Уладзімір Церахаў раіць пагутарыць са спецыялістамі Цэнтра, каб сфарміравалася больш цэльнае меркаванне пра важнасць практычнай работы. Звяртаюся да ўрача-радыёлага Анатоля Харчанкі, які ўжо сорак гадоў як у прафесіі.

***— Які ваш погляд на радыенуклідную дыягностыку? Наколькі вы перакананыя, што гэта актуальна і што медыцына не можа без гэтага развівацца?***



Абследаванне ў Цэнтры радыенукліднай дыягностыкі

вычарпальную інфармацыю пра паталагічны працэс у галаўным мозгу, на сэрцы і многае іншае, што адбываецца на клетачным або субклетачным узроўні ў арганізме чалавека. Адным словам, перспектыва развіцця вялікая. Сусветная практыка медыцыны адыходзіць ад адзінкавых апаратаў. У асноўным укараняюцца апараты, якія сумяшчаюць некалькі дыягнастычных напрамкаў у адным. Напрыклад, у многіх краінах цяпер ідзе распрацоўка аднафатоннай камп'ютарнай тамаграфіі з ядзерна-магнітным рэзанансам. Гэта таксама гібрыдны апарат. У Еўропе гэтым займаюцца такія вядучыя фірмы, як Siemens, General Electric, Philips. У

— Я выкажу не толькі сваё меркаванне. Гэта хутчэй меркаванне спецыялістаў, якія выкарыстоўваюць дадзеныя нашых даследаванняў. Яны прызнаюць, што нашы методыкі на сённяшні дзень незаменныя. Ёсць рэнтгенаўскае даследаванне, ультрагукавое, якія вызначаюць структуру, будову органа. У нас — функцыянальная накіраванасць. Калі мы бачым орган, то атрымліваем выяву функцыянуючай тканкі. Нядаўна была пацыентка ў якой ні УГД, ні ЭКГ не пацвярджалі, што яна перанесла інфаркт міякарду. І толькі наш метад паказаў, што ў яе ўчастак сэрца, недаступны для тых метадаў, дрэнна кровазабяспечваецца. Я не хачу сказаць, што наш метад асноўны. Але наш метад важны. А даследчыкі аб'ядноўваюць усе метады, якія ім даступныя, закладваюць у ЭВМ і даюць клінічнае заключэнне. У нас пакуль справа будучыні, калі збіраюцца на кансіліум урач-кліцыніст, спецыяліст ультрагукавой дыягностыкі і ўрач радыенукліднай дыягностыкі. Садзяцца і выпрацоўваюць агульны дыягназ. У нас пакуль гэтага няма. Але мы ўжо працуем у самым цесным кантакце з урачамі з клінік.

***— Вы можаце сцвярджаць, што дасягненні ў гэтай галіне ўжо даволі істотныя?***

— Досвед і практыка ў нас залежаць ад работы, ад методык. А методыкі залежаць ад апаратуры — ад магчымасцяў апаратуры. Калі распазнавальная здольнасць першых гама-камер была ўсяго толькі тры сантыметры, то цяпер распазнавальная здольнасць з камп'ютарнай тамаграфіяй — да сантыметра, а то і да міліметраў. Удасканаленне апаратуры дае нам больш дакладны метад даследавання: ЭВМ, матэматычная апрацоўка, праграмнае забеспячэнне… Спецыялісты ў нас ёсць. Але недастаткова базы для іх падрыхтоўкі. Трэба пачынаць з курса радыенукліднай дыягностыкі, потым кафедра… Аптымальна, калі выклікаюцца на курсы ўрач, інжынер, медсястра і ўсе разам яны навучаюцца найскладанейшым методыкам. Вяршыня ўсяго — спецыяліст, які будзе ацэньваць атрыманую інфармацыю і даваць заключэнне лечачым урачам.

Уладзімір Церахаў бачыць вельмі актуальнай трансфармацыю Мінскага гарадскога цэнтра радыенукліднай дыягностыкі ў структуру рэспубліканскага ўзроўню. І справа не ў простым павышэнні статуса. Гаворка ідзе пра хутчэйшае распаўсюджванне ўнікальнага досведу, які яны, у Цэнтры, ужо напрацавалі і актыўна акумулююць у клінічнай практыцы ў сталіцы. Але важна, каб досвед гэты прыйшоў у рэгіёны, каб яго выкарыстоўвалі паўсюдна ў краіне практыкуючыя ўрачы. Карысць ад гэтага, у першую чаргу, адчуюць пацыенты. Уладзімір Церахаў упэўнены, што гэты час прыйдзе. Але яму як спецыялісту, які хварэе за сваю справу, усё ж такі хацелася, каб ён надышоў хутчэй. Бо важна не спазніцца.

Уладзімір **Міхайлаў**

# Атрымаць месца ў вёсцы, не выязджаючы з горада

## На карце Мінска “Студэнцкая вёска” — гэта асобны вялікі мікрараён. Не спальны.

Усяго шэсць гадоў назад тут была пустка. Ускраіна горада. Але блізкасць да карпусоў Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта і станцыі метрапалітэна прымусілі прыглядзецца да месца ўважлівей. Так, адна за адной выраслі сем прыгожых шматпавярховак. Комплекс будынкаў назвалі “Студэнцкая вёска”.

За некалькі гадоў новенькія інтэрнаты абраслі магазінамі і гандлёвымі цэнтрамі. Быў пабудаваны спартыўны комплекс. Не так даўно ў прыбудове аднаго з інтэрнатаў адкрылі яслі-сад, якія прымаюць не толькі дзетак студэнцкіх сем’яў, але і з суседняга спальнага мікраёна Брылевічы. Хутка ў маладзёжным гарадку адкрыюцца гасцініца, паліклініка, пункты бытавога абслугоўвання, падземныя аўтастаянкі, культурна-забаўляльны цэнтр. Інфраструктуру абяцаюць больш крутую, чым у кампусах некаторых еўрапейскіх універсітэтаў.

### Вучыся добра, прапіску атрымаеш

У “Студэнцкую вёску” хочуць патрапіць усе іншагароднія студэнты. Новенькія, сучасныя дамы. Гэта вам не старыя дапатопныя “інтэрнаты”. Кожны студэнт марыць жыць тут, але прапісацца не так ужо і проста. Месцы ў новабудоўлях размяркоўваюць дэканаты ўніверсітэтаў. Першымі засяляюцца льготнікі і выдатнікі.

У студэнткі шостага курса Вольгі Сасімовіч не за гарамі размеркаванне, утульны пакой у “вёсцы”, на жаль, давядзецца пакінуць:

— У мяне чатырохгадовы досвед жыцця ў інтэрнаце калідорнага тыпу. Ёсць з чым параўноўваць. Два гады назад пераехала сюды. У многіх маіх знаёмых кватэры горшыя, чым наш пакой у “вёсцы”. У нас усё ўладкавана так: у блоку агульная прыхожая, два пакоі на дваіх і на траіх, раздзельны санвузел і ўладкаваная кухня.

### У “дзясятку” са сваім мяшком бульбы

Летась лепшым студэнцкім інтэрнатам Мінска прызналі інтэрнат № 10 медыцынскага ўніверсітэта (на студэнцкім слэнгу — проста “дзясятка”). Магу пацвердзіць — па праву. Уваходныя дзверы адчыняюцца — і трапляеш у прасторны хол з мяккімі канапамі і тэлевізарам. Злева ад уваход — сталовая, цэны ў якой радуюць студэнцкім дэмакратызмам і разнастайнасцю. Канечне, не хатняя кухня, але гастрытаў пазбегнуць дапаможа.

На ніжнім ярусе — гаспадарчы блок. Часцей за ўсё студэнты карыстаюцца пральняй, дзе ўсталяваны дзесяць пральных машын і пяць сушыльных барабанаў. Карыстанне машынамі бясплатнае, але пральны парашок — свой.

Каб не захламляць пакоі, будучыя медыкі цягнуць рэчы, непатрэбныя кожны дзень, у камеры захоўвання, а банкі з варэннем і мяшкі бульбы — на склад агародніны. На першым паверсе “дзясяткі” — здраўпункт. На днях там усіх прышчаплялі ад грыпу.



БЕЛТА

## “Драмгурток, гурток па фота, а мне яшчэ й спяваць ахвота...”

Холы інтэрнатаў у “Студвёсцы” нагадваюць галерэю сучаснага мастацтва. На сценах фатаграфіі і карціны, у калідорах — мудрагелістыя інсталяцыі. Творчасць у студэнцкай вёсцы ў пашане. Рукадзеллем займаюцца на 12-м паверсе. Там жа ёсць выставачная зала, куды я і зазірнула. Проста музей народнай творчасці: раскошныя кветкі з бісеру, саламяныя лялькі, модныя скураныя сумачкі. Усё гэта справа рук студэнтак, для якіх інтэрнат на гады вучобы стаў родным домам.

Пакуль шукала ў інтэрнаце сваю суразмоўніцу Вольгу, набрыла на цікавае месца. У зале рэлаксацыі ёсць самавар, тэлевізар. І тут студэнты прымаюць звычайна гасцей — бацькоў, сяброў на дні нараджэнні ды іншыя святы.

А вось спартыўную залу Вольга паказвала з гонарам сама: тут ёсць усё для заняткаў — трэнажоры, штангі і гіры і г. д. Гаворыць, увечары ў зале яблыку няма дзе ўпасці. Дзяўчаты займаюцца аэробікай, фітнесам, шэйпінгам, чарлідынгам. І ў кожную секцыю жадаючых хоць адбаўляй!

— На днях адкрываем студыю бальнага танца, — гаворыць загадчыца інтэрната Зоя Гілько. — Працаваць з нашымі хлопцамі і дзяўчатамі стане прафесійная танцоўшчыца. Гэта будзе адзіны платны гурток. Затое розныя



Творчасць у студэнцкай вёсцы ў пашане

квэсты, кінапаказы, якія прыдумляе студэнцкі савет інтэрната, робяць жыццё студэнтаў багацейшым і цікавейшым цалкам бясплатна.

Пра вучобу ў інтэрнаце не забываюць. На кожным паверсе — пакоі самападрыхтоўкі. Падчас сесіі гэта самае папулярнае месца, некаторым даводзіцца прыносіць свой стул!

## Танна і несярдзіта

Як аказалася, са “студэнцкага раю” могуць і выгнаць.

— Высяленні не часта, але бываюць, — гаворыць старшыня студэнцкага савета інтэрната Дзмітрый Карунін. — Часцей за ўсё за парушэнне дысцыпліны, чым звычайна грашаць хлопцы-старшакурснікі. Ім падаецца, што правілы пісаны не пра іх. А патрабаванні простыя: не парушаць правілаў, прыбіраць у пакоі, своечасова плаціць. Месяц жыцця ў студэнцкіх “апартаментах” ацэньваецца ў дзвесце шаснаццаць тысяч рублёў, гэта значыць прыкладна ў 780 расійскіх рублёў.

## Успомніць усё — і запісаць

Да Дня студэнта, які прайшоў у адным з інтэрнатаў мінскага студгарадка, была прымеркавана незвычайная тэматычная акцыя. Студсавет “чацвёркі” (савет інтэрната) вырашыў стварыць цэлую скарбонку ўспамінаў студэнтаў.

Хлопцы і дзяўчаты змаглі падзяліцца сваімі “подзвігамі” ў рукапісным “Дзённіку студэнта” і выказаць сваё стаўленне да студэнцкага жыцця. Як аказалася, гэтая “кніга памяці” выклікала жывую цікавасць у моладзі. Некаторыя жыхары даволі адкрыта падзяліліся на яе старонках успамінамі пра самыя яркія моманты студэнцкага быцця. Прычым успаміны запісваліся ўручную, без выкарыстання прывычных гаджэтаў.

Па выніках дня “чацвёрачка” абзавялася “сховішчам” студэнцкіх успамінаў, а заадно яркім плакатам і відэаролікам, прысвечаным Дню студэнта. Акцыю хочуць зрабіць традыцыйнай і, калі атрымаецца, распаўсюдзіць яе па ўсіх інтэрнатах студэнцкага гарадка.

Крысціна **Хілько**

**У тэму**

## І фан-гарадок таксама!

**У гісторыю “Студэнцкай вёскі” ўпісана цікавая старонка. У маі 2014 года, падчас чэмпіянату свету па хакеі, маладзёжны гарадок ператварыўся ў хостэл для замежных балельшчыкаў.**

**— Госці былі ў захапленні ад нашых інтэрнатаў, — расказвае першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Таццяна Калядка. — Яны думалі, раз тут жывуць студэнты, то акуратнасці, прыгажосці і камфорту не чакай. Але на самай справе ўсё не так! У кнізе пажаданняў — захопленыя водгукі.**

**Магчыма, алімпійская казка на Паўднёвым Захадзе Мінска хутка вернецца. Бо ў 2019 годзе горад будзе прымаць яшчэ адзін грандыёзны спартыўны форум — Еўрапейскі юнацкі алімпійскі фестываль. І студэнты з задавальненнем прымуць у свой дом новых гасцей з усяго свету.**

БЕЛТА






# “Маскарад” у фэйсбуку

## Марк Цукерберг, кіраўнік папулярнай ва ўсім свеце сацыяльнай сеткі, набыў беларускую кампанію, якая распрацавала дадатак MSQRD, што замяняе твары на маскі

### Леа можа стаць... ільвянём

Навіна пра тое, што ўладальнікам беларускай кампаніі Masquerade Technologies стаў Марк Цукерберг, ператварылася ў сенсацыю. Бо бізнесмен укладвае грошы толькі ў мегапаспяховыя праекты. Цану трымаюць у сакрэце, але лік ідзе прыкладна на 100-150 мільёнаў долараў.

— Дзякуй усім, хто павіншаваў каманду MSQRD. Абсалютна бліскучы цім. Зоркі! — напісаў на сваёй старонцы ў Фэйсбуку беларускі IT-гуру Юрый Гурскі, які падтрымаў маладых распрацоўшчыкаў.

— Ім па 23-24 гады, і я гатовы ставіць каньяк скрынямі, што гэта не апошняя навіна пра хлопцаў.

Рашэнне мільярдэра набыць фірму зразумелае. Таленавітыя праграмісты не толькі прыдумалі ўнікальную новую тэхналогію, але і стварылі дадатак, які ў кароткія тэрміны набраў шалёную папулярнасць.

З’явіўся MSQRD усяго чатыры месяцы назад. Цяпер яго запампавалі больш за 15 мільёнаў разоў. У хуткім часе можна смела чакаць яшчэ большага росту папулярнасці: на днях дадатак стаў даступны не толькі на iOS, але і на Android.

У “Маскарадзе” 50 масак. Акрамя жывёл, ёсць твары Леанарда Ды Капрыа, Джоні Дэпа, Дональда Трампа і, вядома, знакамітая маланка Дэвіда Боўі. Проста запускаеш, глядзіш у камеру — і цябе грыміруюць у рэжыме анлайн. Кожная маска ідэальна кладзецца на твар і паўтарае міміку. У вобразе можна зрабіць сэлфі, запісаць відэа для сяброў і закінуць усё ў сацсетку або проста захаваць сабе на памяць.

Сярод карыстальнікаў шмат знакамітасцяў. Нават маці акцёра Леанарда Ды Капрыа прымерыла маску з тварам сына і двума “Оскарамі”.

## Стартап за два дні

Дзіўна: першую версію распрацоўшчыкі стварылі ўсяго за двое сутак. Тады было толькі восем эфектаў: вусы, маска тыгра, маска малпы… Такога поспеху не чакалі. Хлопцы запэўніваюць: на піяр не патрацілі ні капейкі. Заснавальнік Яўген Няўгень гаворыць, што спачатку навінку тэставалі сябры:

— Усе былі ў захапленні, пыталіся, дзе запампаваць. І мы выпусцілі дадатак напярэдадні Раства. Галоўнае, відэа і фота з нашай праграмы сталі з'яўляцца ў медыяперсон. Першым "вывеў у свет" дадатак вядомы рэпер Баста. "Запосціў" у Інстаграме відэа ў вобразе зайчыка. Былы саліст групы "Чай удвух" Стас Касцюшкін прымераў на сябе твар барадатай Канчыты Вурст. І панеслася!

## Бэтман ды іншыя

— У зусім маладых самы папулярны персанаж Сталін, — гаворыць Яўген Няўгень. — Але, мяркуючы па ўсім, у гэтай масцы для жартаўнікоў уся фішка ў вусах, а не ў палітычнай персоне. Бо многія нават і не ведаюць, хто гэта!

Фанаты закідалі распрацоўшчыкаў просьбамі: просяць зрабіць маскі Бэтмена, Джокера, Халка ды іншых кінагерояў.

— Будучыня стасункаў — за відэачатамі, — упэўнены Яўген. — Але ў адрозненне ад тэкставых паведамленняў, дзе нормай сталі смайлікі і стыкеры, у відэасувязі не было магчымасці такой пазітыўнай рэакцыі на суразмоўцу. Гэты прабел мы і запоўнілі. Мэта наступнай версіі — каб любы карыстальнік ствараў свае маскі. У Бразіліі свае персанажы, у Японіі — свае, і ў нас будзе вялікі каталог.

Крысціна **Хілько**



TUT.BY

Masquerade Technologies заснавалі Яўген Няўгень (злева), Сяргей Ганчар (на пярэднім плане) і Яўген Зацяпякін у 2015 годзе. Першая рэальная версія дадатку MSQRD была зроблена за 48 гадзін. Яўген Няўгень таксама з'яўляецца заснавальнікам стартапа SplitMetrics (Maps.me) і крэатыўным дырэктарам дабрачыннага аўкцыёну сустрэч "МаеСэнс"

**Даведка**



### World of tanks, Viber... Хто наступны?

***Аляксей ЛЯШЧОЎ, намеснік дэкана факультэта камп'ютарных сістэм і сетак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі:***

*— Беларусь — краіна з інтэлектуальным рэсурсам. І ён актыўна праяўляецца ў папулярнай і прыбытковай IT-сферы. Але аднаго рэсурсу мала, важна стварыць умовы для яго развіцця. Дзяржава "укладваецца" ў чалавечы рэсурс: для школьнікаў праводзяцца розныя алімпіяды, IT-турніры. Вышэйшая адукацыя — профільная, і вельмі якасную адукацыю дае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі — выпускае запатрабаваных спецыялістаў IT-сферы. Для працвітання праграмістаў у Беларусі робіцца нямала. Да прыкладу, Парк высокіх тэхналогій стрымлівае адток кадраў за мяжу. Таленавітыя маладыя людзі атрымліваюць добрую зарплату, часта выязджаюць у камандзіроўкі за мяжу і выпускаюць прадукты, якія становяцца вядомымі ва ўсім свеце. Беларуская анлайн-гульня World of Tanks, месенджар Viber, дадатак "Маскарад" гэта пацвярджаюць. І яны — не апошнія.*

## Дзіўныя схованкі

**Мінчанін Яўген Шапашнікаў траціць уласныя сродкі на прыдуманыя ім схованкі**

Купюры ён засоўвае ў капсулы і праз спецыяльны мабільны дадатак прапаноўвае знайсці іх любому жадаючаму. Мэта? Гаворыць, што самая высакародная: "Хачу, каб людзі адарваліся нарэшце ад камп'ютараў, выйшлі з дома і пагулялі па горадзе".

У мабільным дадатку з'яўляюцца фотападказкі пра месцы, дзе знаходзяцца схованкі. Ужо знойдзена 16 капсул. Яўген расказвае, што год назад ён ужо ладзіў для мінчан падобныя выпрабаванні: тады падказкі з'яўляліся ў яго блогу:

— Каб паведаміць астатнім, што схованка знойдзена, трэба ўвесці ў дадатку спецыяльны код, які будзе ў капсуле.



Арганізатар незвычайнага гарадскога квэста не хавае, што ў перспектыве мае намер і зарабіць, прадаючы праз спонсара франшызы або падказкі. Гаворыць, што схованкай ужо зацікавіўся адзін буйны банк і, мяркую, плануе праз некалькі месяцаў выдзеліць для шукальніка скарбаў значныя сумы. Разглядае Яўген і варыянт заробку на падказках: за грошы можна будзе даведацца пра першую літару вуліцы або прыкладную адлегласць да схованкі ад цэнтра горада. Праўда, такія падказкі ён плануе ўкараняць за межамі краіны. Для мінчан жа пошук схованак абяцае пакінуць бясплатным.



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

# Да нас завітала лета

**У Мінск прыйшло сапраўднае лета. Гараджан яно не заспела знянацку: у горадзе ёсць нямала месцаў, дзе можна з камфортам адпачыць.**

У паўночна-заходняй частцы Мінска раскінуўся вялікі вадаём. Камсамольскае возера — адно з самых папулярных месцаў адпачынку. Дарэчы, тэрыторыя вадасховішча займае амаль паўсотні гектараў, а максімальная глыбіня ў некаторых месцах дасягае чатырох з паловай метраў.

Карэнныя мінчане добра памятаюць гісторыю яго ўзнікнення, якая пачалася ў 1940-м годзе. Катлаван камсамольцы капалі ўручную, спецтэхнікі тады яшчэ не было. Ужо праз год планавалася ўрачыстае адкрыццё вадаёма з удзелам духавых аркестраў, з канцэртнымі пляцоўкамі, атракцыёнамі і чырвоным сцягам з зоркай, усталяваным прама ў цэнтры возера. Тут жа хацелі пабудаваць яшчэ і стадыён на дзесяць тысяч месцаў, каб гледачы магліназіраць спаборніцтвы па веславанні. Але планам перашкодзіла вайна.

Сёння на Камсамольскім возеры можна з камфортам правесці ўвесь дзень. Тут ёсць усё неабходнае для адпачынку і забаў: двухпалубны карабель, які курсіруе вакол астравоў, што акружаюць вадаём, веласіпедныя дарожкі,



батуты, катамараны, пляцоўкі для гульні ў тэніс, валейбол, баскетбол... Нават ёсць трэнажорная зала пад адкрытым небам! І адведзеныя месцы для барбекю з альтанкамі і ўбудаванымі мангаламі. Можна перакусіць і ў прыбярэжных кафэ. Аматары паходаў разбіваюць палаткі ў аддаленых месцах, куды можна дабрацца толькі "ўплаў" ці на катамаранах. І, само сабою, ля берага стаяць душавыя кабінкі і раздзявальні.

Паўднёвы бераг Камсамольскага возера патанае ў зяляніне лесу. Гэта парк Перамогі, што раскінуўся на 200 гектараў зямлі. Ён быў адкрыты ў гонар перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Тут можна схавацца ад паўдзённага сонца, прайсціся ўздоўж шумных фантанаў, паслухаць спеў птушак. Дзеці знойдуць у лесе мноства арэляў і горак. Але самая галоўная "славутасць" парку — Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Тэматычным завяршэннем нашай віртуальнай прагулкі па ваколіцах Камсамольскага возера можна назваць мемарыяльны комплекс — "Мінск — горад-герой". Штогод сюды прыходзяць сотні беларусаў, каб адсвяткаваць Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці, а таксама Новы год, які адзначаны традыцыйным салютам.

Адпачыць з камфортам можна не толькі на ўлонні прыроды. Акружаная дамамі і ажыўленымі вуліцамі, размясцілася летняя тэраса мінскага Палаца воднага спорту. Вось ужо як шэсць гадоў у самы першы дзень лета ён адкрывае купальны сезон пад адкрытым небам. На тэрыторыі тэрасы ёсць круглая акваторыя з мінеральнай вадой і басейн для самых маленькіх. Таксама для дзяцей прадугледжана гульнявая пляцоўка. Загараць можна на шэзлонгах, але некаторыя не супраць прылегчы і на траве. Разнастаіць адпачынак дапамагаюць гульні ў баскетбол або валейбол. Ужо з самага ранку тут шматлюдна. У абед, як правіла, шэзлонгі пусцеюць — мала хто любіць ляжаць на спякоце.

Адкрыццё аквапарку "Лебядзіны" чакалі, падаецца, усім горадам. І нарэшце, ён адкрыўся ў мінулым годзе. Першы беларускі парк водных забаў — адзін з найбуйнейшых у краінах СНД і пяты па велічыні ў Еўропе. Ён размясціўся на 32 000 квадратных метраў на беразе вадасховішча "Дразды" — яшчэ аднаго жывапіснага месца адпачынку. Каб адчуць маштаб акваторыі, прывяду некалькі лічбаў: "Лебядзіны" здольны прыняць амаль дзве тысячы чалавек. Яго прапускная здольнасць за суткі ўлетку дасягае амаль васьмі тысяч, а за год — два з паловай мільёны наведвальнікаў. Аквапарк дзеліцца на дзве пляцоўкі: адкрытую — летнюю і закрытую, якую можна наведваць круглы год. Яшчэ б! Тут столькі забаў нават для тых, хто не любіць плаваць! Ёсць дзіцячы цэнтр з атракцыёнамі, ёсць "тэрыторыя прыгажосці" з поўным пералікам аздараўленчых працэдур. Можна пайсці ў трэнажорную залу. І нават па начах у аквапарку жыццё працягваецца дзякуючы гарачым вечарынкам. На пірсе парку можна палюбавацца прыгажосцю прыроды вадасховішча і пакатацца на катамаранах. І, нарэшце, заначаваць у гатэлі, які знаходзіцца там жа.



*Аквапарк — гэта цэлы востраў пазітыўнага адпачынку і яркіх уражанняў. Тут цішыня, здаецца, аглушае, а паўсюдная зеляніна насычае кіслародам ды энергіяй. Менавіта такая прырода схавае ад гарадской мітусні і паспрыяе адпачынку*



**_Нягледзячы на тое, што Цнянка знаходзіцца ў межах Мінска, калі сюды трапляеш, ствараецца адчуванне, што выехаў за горад. І падаецца, што навокал мала людзей. Хоць афіцыйна тут налічваецца аж пяць пляжаў_**

Я шчэ мінчане любяць адпачываць на Цнянцы. Дарэчы, сюды, да вадаёма, як і на Камсамольскае возера, лёгка дабірацца: на трамваі, а потым крыху прайсціся. У гэтых напрамках курсіруюць і тралейбусы, і маршруткі, і аўтобусы. Амаль сотню гектараў займае плошча вадасховішча, а ў глыбіню возера дасягае васьмі метраў. Катлаван ніхто не капаў, ён мае натуральнае паходжанне. Першапачаткова вадаём быў створаны для прамысловых патрэбаў. Але неўзабаве возера ператварылася ў зону адпачынку.

Нягледзячы на тое, што Цнянка знаходзіцца ў межах Мінска, калі сюды трапляеш, ствараецца адчуванне, што выехаў за горад. І падаецца, што навокал мала людзей. Хоць афіцыйна тут налічваецца аж пяць пляжаў.

Цнянскае вадасховішча існуе ўжо 35 гадоў. Летась пачалася яго глабальная рэканструкцыя. У сувязі з гэтым адміністрацыя раёна прапанавала грамадзянам прыдумаць свае назвы мясцовых пляжаў ці прагаласаваць за існуючыя варыянты.



ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК

На абноўленым возеры з'явіліся пірсы. Тут можна назіраць захад сонца і карміць качак ледзь не з рукі. Дабавіліся спартыўныя і назіральныя пляцоўкі, веладарожкі. Ёсць альтанкі і мангалы. Дарэчы, абсталяваныя для пікнікоў месцы папулярныя не толькі ў летні час. Яно і зразумела: жаданне быць бліжэй да прыроды не заменіш ніякімі выгодамі цывілізацыі. А вось стацыянарных кафэ і магазінаў тут пакуль няма. Гэта і да лепшага: нішто не парушае загарадную атмасферу. Хоць мясцовыя ўлады паклапаціліся пра магчымасць падключэння абсталявання да электрасеткі. Так што ў адпачывальнікаў ёсць магчымасць паласавацца марожаным.

Цнянскае возера — гэта і цэнтр вадохрышчанскіх ныранняў. Кожны год у студзені аматары экстрэмальных відаў загартоўвання здзяйсняюць рытуальныя купанні. У апошнія гады да іх далучыліся супрацоўнікі МНС, для якіх старажытны абрад стаў прафесійнай традыцыяй. А ўвесну на Цнянку прылятаюць лебедзі. Адпачывальнікі з задавальненнем іх падкормліваюць. У падзяку лебедзі дазваляюць сябе пагладзіць, што выклікае асаблівае захапленне ў дзяцей.

А яшчэ пра фантаны. Адзін з самых вялікіх фантанаў у горадзе знаходзіцца каля Вялікага тэатра оперы і балета, яго ёмістасць — 300 тысяч літраў вады. Яе хапіла б, каб напоўніць басейн стандартных памераў. Найстарэйшаму ў горадзе фантану пад назвай “Хлопчык з лебедзем” больш за 140 гадоў. Ён быў пабудаваны ў гонар першага пушчанага ў Мінску водапровода. Знаходзіцца рукатворны гейзер у Аляксандраўскім скверы.

Фантан на плошчы Незалежнасці мае 512 рознакаляровых струменьчыкаў, якія прыгожа падсвечваюцца ўвечары. Каб водная канструкцыя працавала без перабою, на яе траціцца 200 кілават электраэнергіі. Гэта ўсё роўна, што ўключыць у разетку адначасова паўтары сотні электрачайнікаў! Хоць фантан “Ветразь”, што на Камсамольскім возеры, спажывае энергіі ў чатыры разы больш.

Фантан “Юнацтва” — адна з самых рамантычных скульптур Мінска. Худзенькія хлопчык і дзяўчынка стаяць на адной каленцы з чашай у руках, каб напаіць адно аднаго вадою. Фантан знаходзіцца побач з касцёлам Святога Сымона і Алены. Гавораць, калі пацерці каленку адной са статуй, усе праблемы з асабістага жыцця знікнуць.

Прыгожую скульптурную кампазіцыю можна ўбачыць у парку імя Янкі Купалы каля цырка: над басейнам нахіліліся бронзавыя фігуры дзяўчат, якія кідаюць вянкі ў ваду. Гэта даўняя традыцыя варажыць на жаніха ў свята Купалля.

Аліса **Красоўская**



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

***Найстарэйшаму ў горадзе фантану пад назвай “Хлопчык з лебедзем” больш за 140 гадоў. Ён быў пабудаваны ў гонар першага пушчанага ў Мінску водапровода. Знаходзіцца рукатворны гейзер у Аляксандраўскім скверы***

# Мы бачым і чуем адзін аднаго




## Упершыню тэлемост злучыў гарады-пабрацімы Мінск і Новасібірск

У пачатку красавіка як у Беларусі, так і ў Расіі адзначалася 20-годдзе падпісання першых пагадненняў, якія паэтапна прывялі да стварэння Саюзнай дзяржавы. Святам даражаць і новасібірскія беларусы: мінулыя гады ўмясцілі шмат нашых добрых спраў на карысць брацкіх народаў. Пра гэта гаварылася і падчас тэлемоста паміж гарадамі-пабрацімамі Мінскам і Новасібірскам, які прайшоў напярэдадні юбілею.

У Вялікай зале мэрыі Новасібірска, упрыгожанай нацыянальнымі сцягамі Расіі і Беларусі, сабраліся на чале з мэрам Анатолем Локцем дэпутаты гарсавета, кіраўнікі раённых адміністрацый горада, супрацоўнікі Новасібірскага цэнтра беларускай культуры, прадстаўнікі нацыянальна-культурных аўтаномій беларусаў, грамадскіх і культурных арганізацый, а таксама бізнесу. Прысутнічалі Саветнік, кіраўнік аддзялення Пасольства Беларусі ў Расійскай Федэрацыі ў Новасібірску Сяргей Пяткоў і прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Расіі ў Новасібірску Мікалай Афанасаў. А тым часам у Зале пасяджэнняў Мінскага гарвыканкама на чале з Андрэем Шорцам таксама сабраліся прадстаўнікі гарадской улады, грамадскіх і культурных арганізацый, бізнес-супольнасці, вядомыя людзі Беларусі.

У прывітальных словах кіраўнікі гарадоў адзначылі: важны ўклад кожнага з бакоў у развіццё брацкіх адносінаў. “Нягледзячы на тое, што мы і раней выбудоўвалі вельмі надзейныя, дружалюбныя адносіны з Новасібірскам, павінен сказаць: афіцыйны пабрацімскі статус — гэта ўжо якасна новы ўзровень работы. Перад намі адкрываюцца шырокія перспектывы для ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва”, — сказаў Андрэй Шорац. Гаварылі таксама пра перспектывы далейшай работы. Бо зносіны пры дапамозе сучасных тэхналогій і былі задуманы для карысці справы. Зрэшты, сёння, адзначалася, важна не толькі бачыць, чуць, але і разумець адзін аднаго, адчуваць, дзе мы можам быць узаемна карыснымі. Як вядома, супрацоўніцтва паміж Беларуссю і рознымі сібірскімі рэгіёнамі Расіі ў галіне эканомікі, навукі, культуры развіваецца не першы год. Пра гэта гаварылі, прыводзячы канкрэтныя прыклады, усе ўдзельнікі відэаканферэнцыі.

А пераняць адзін у аднаго нам ёсць шмат чаго. Паводле слоў Сяргея Пяткова, ва ўмовах нестабільнасці на сусветным рынку такое супрацоўніцтва неабходнае і важна павялічваць тавараабарот паміж краінамі. Патрэбна, адзначыў дыпламат, і праграма далейшага развіцця расійска-беларускага супрацоўніцтва па абмене інфармацы-

яй. Гэта, несумненна, дапаможа фарміраваць станоўчы імідж Беларусі, а значыць, павысіць цікавасць расійскіх бізнес-партнёраў да эканомікі краіны.

Гаварылі пра важную ролю, якую адыгрываюць Дні Рэспублікі Беларусі ў Сібіры — яны прайшлі ў Новасібірску і восенню мінулага года. Многія змаглі ўбачыць тэхніку, прамысловыя і харчовыя тавары, якія ўжо пастаўляюцца з Беларусі або, як гаворыцца, на падыходзе. Беларускія прадпрыемствы, асвойваючы новыя рынкі збыту, ужо ўносяць вялікі ўклад у развіццё аграпрамысловага комплексу Новасібірскай вобласці. Прыводзіліся характэрныя лічбы: на кірмашы-2015 сваю прадукцыю прадставіла каля 30 беларускіх прадпрыемстваў. Вялікай папулярнасцю ў пакупнікоў карысталіся абутак, вопратка, мясная і малочная прадукцыя, а таксама кандытарскія вырабы, цукеркі, шакалад. У 2014-м, дарэчы, прадпрыемстваў было толькі шэсць. Не сакрэт: большасць беларускіх вытворцаў прыязджаюць на кірмаш для таго, каб знайсці ў Сібіры партнёраў, з якімі можна будзе непасрэдна працаваць.

Андрэй Шорац адзначыў: ужо каля 250 прадпрыемстваў Мінска ажыццяўляюць актыўную гандлёвую дзейнасць у рэгіёне. Па выніках 2015 года тавараабарот паміж Мінскам і Новасібірскай вобласцю склаў звыш 60 мільёнаў долараў. Асновай экспарту сталі трактары, нафта і нафтапрадукты, вылічальныя машыны, трансфарматары. Даўняе супрацоўніцтва, адзначыў першы сакратар Пасольства Расіі ў Беларусі Андрэй Грэшнікаў, звязвае Сібірскае аддзяленне Расійскай акадэміі навук і Нацыянальную акадэмію навук Беларусі. Як вядома, доўгія гады аддзяленнем РАН у Новасібірску кіраваў Валянцін Капцюг — беларус па родавых каранях (яго бацька нарадзіўся на Віцебшчыне, вымушаны быў адтуль з'ехаць у гады сталінскіх рэпрэсій), навуковец з сусветным іменем. Сумесныя намаганні навукоўцаў даюць плён у галіне энергетыкі, створаны новыя гатункі сельгаскультур. Беларускі бок праяўляе асаблівую цікавасць да багатага сібірскага досведу перапрацоўкі нафты, бо ў Беларусі працуюць буйныя нафтаперапрацоўчыя вытворчасці. Сібірскія навукоўцы зацікаўленыя ў больш шчыльным супрацоўніцтве з калегамі ў галіне інжынерных біятэхналогій, вытворчасці лекавых прэпаратаў, а таксама ўгнаенняў, іншых рэчываў для сельскай гаспадаркі.

***Зносіны пры дапамозе сучасных тэхналогій і былі задуманы для карысці справы. Зрэшты, сёння, адзначалася, важна не толькі бачыць, чуць, але і разумець адзін аднаго, адчуваць, дзе мы можам быць узаемна карыснымі***

Як жа скаардынаваць работу навукоўцаў на перспектыву? У планах — стварэнне Цэнтра, які дапаможа ўзгодненасці ў рабоце акадэмічных інстытутаў Беларусі і Расіі. А прэмія імя выдатнага новасібірскага навукоўца, акадэміка РАН Валянціна Капцюга ўжо па чарзе ўручаецца сібірскім і беларускім вучоным за сумесныя навуковыя дасягненні. Дарэчы, у Новасібірскім Акадэмгарадку ў 2001 годзе ўсталяваны бюст акадэміку Капцюгу на праспекце яго імені. Дык, можа, варта гарадскім уладам Мінска і Новасібірска разам падумаць і пра ўвекавечанне памяці, усталяванне помніка знакамітаму беларусу і ў Беларусі, на гістарычнай радзіме?

Падчас тэлемоста актыўна гаварылі пра тое, як далей развіваць культурныя сувязі паміж Новасібірскам і Мінскам. Як адзначыла начальнік Дэпартамента культуры, спорту і маладзёжнай палітыкі мэрыі Новасібірска Ганна Церашкова, у многіх беларусаў і рускіх не толькі адна — хрысціянская — вера, але і блізкія карані, ёсць агульныя культурныя традыцыі. Яна запрасіла мінчан у госці на Дзень горада, а таксама на Дзень Хрышчэння Русі, іншыя святы, у якіх разам з карэннымі сібіракамі актыўна ўдзельнічаюць і сібірскія беларусы. Адзначым, некаторыя з іх — ужо самі спадчынныя сібіракі: іх продкі больш за сто гадоў назад пакінулі гістарычную радзіму.

Зрэшты, культурны абмен — гэта як дарога з двухбаковым рухам. Бо і новасібірцаў беларусы пастаянна за-




ЛІЗАВЕТА ДАБРЫЦКАЯ



парце. Добра, што з Узмёнаў у раённы цэнтр многія на работу ездзяць. Пасля шасці ўрокаў гісторыі правяла "класную гадзіну", пагутарыла з бацькамі вучняў. Так што прадоўжыць нашу гутарку мы змаглі толькі пасля 15.00.

***— Як вы сталі ўдзельніцай конкурсу Саюзнай дзяржавы?***

— Маладых настаўнікаў гісторыі ў Верхнядзвінску няшмат. Калі мяне папрасілі абараніць гонар раёна, я звярнулася да свайго метадыста — Наталлі Тамашэвіч. Цікава, што яна не толькі мая цёзка па прозвішчы, але і мая былая настаўніца. Яна вяла ў мяне гісторыю ў сельскай школе ва Узмёнах, а затым пераехала ў Верхнядзвінск. Наталля Леанідаўна — настаўнік ад бога! Ва Узмёнах яна стварыла школьны музей, дзе мы, старшакласнікі, афармлялі стэнды, спрабавалі сябе ў ролі экскурсаводаў. Прафесію я шмат у чым дзякуючы ёй выбрала. Што ж датычыцца конкурсу Саюзнай дзяржавы, то тэму мне параіла менавіта Наталля Леанідаўна. Аказваецца, ваенны фотакарэспандэнт Хандогін да вайны жыў у вёсцы Валынцы Верхнядзвінскага раёна. Напярэдадні Вялікай Айчыннай ён служыў у Ленінградскай ваеннай акрузе. Калі гітлераўцы напалі на СССР, яго назначылі ваенным фатографам цэнтральнай армейскай газеты "Красная звезда". Пасля перамогі ён застаўся ў Ленінградзе, але часта прыязджаў на малую радзіму, сустракаўся са школьнікамі, перапісваўся з імі. Пасля смерці ў 1989-м яго пахавалі ў родных Валынцах.

***— Чым запомнілася ўзнагароджанне?***

— Мне ўручылі грамату, электронны планшэт і вялікія, добра ілюстраваныя кнігі пра Вялікую Айчынную вайну. Акрамя гэтага, для ўсіх фіналістаў конкурсу арганізавалі экскурсіі, семінары. Больш за ўсё запомніліся жывыя зносіны з Юрыем Вяземскім, вядучым тэлеперадачы "Разумнікі і разумніцы", а таксама майстар-клас заслужанага настаўніка Расіі Ігара Карачанцава. Ён правёў для нас паказальны ўрок, падчас якога душу роднага Санкт-Пецярбурга раскрыў праз прызму блакаднага Ленінграда. Ён так віртуозна звязаў ваенны час з сучаснасцю, што я і астатнія слухачы былі ў поўным захапленні.



СЯРГЕЙ ГАЛЕСНІК

***Як добра, што ёсць маладыя таленавітыя калегі, якім можна перадаць багаты назапашаны матэрыял***

## Школа выкладання ў глыбінцы

У Верхнядзвінску Дзіна Тамашэвіч працуе трэці год. Да гэтага выкладала ў сельскай школе ў вёсцы Касары Ушацкага раёна, куды трапіла па размеркаванні пасля заканчэння ўніверсітэта. У глыбінцы, гаворыць, ёсць свае плюсы:

— Жыццё, школьнае ў тым ліку, там цячэ марудна. Мне там падабалася. Але жыллё ва Ушачах мне не выдзелілі. А здымаць кватэру з зарплатай у 4 мільёны рублёў складана. У мяне была магчымасць перайсці ў раённы аддзел культуры. Паклікалі туды, калі мы з вучнямі выйгралі абласны фестываль народнай творчасці. Там я спявала, а яны танцавалі. І хоць зарплата там была яшчэ меншая, я гатова была застацца ва Ушацкім раёне. Аднак сур'ёзна захварэў бацька, і я перабралася ў Верхнядзвінск, каб быць бліжэй да дому.

Да ўсяго, што звязана з выкладаннем любімага прадмета, Дзіна ставіцца вельмі сур'ёзна, а часам — крытычна:

— Мне падаецца, што школьнікі лічаць гісторыю другарадным прадметам. Думаюць: вывучу параграф і адкажу! А мне хочацца, каб яны разумелі, аналізавалі. Але часу на гэта ў школе, на жаль, няма. Два ўрокі на тыдзень (сусветная гісторыя плюс гісторыя Беларусі) — катастрафічна мала! Да таго ж экзамен у 9-м класе знялі, што не спрыяе папулярызацыі прадмета. Але ж хочацца, каб у маладых людзей абуджалася нацыянальная самасвядомасць, каб яны ганарыліся сваёй краінай, яе гісторыяй.

Мы развіталіся каля шасці вечара. Дзіна спяшалася ў раённы Дом культуры на рэпетыцыю ансамбля "Ярыца". З беларускімі народнымі песнямі яго ўдзельнікі выступаюць на "Славянскім базары", на свяце работнікаў вёскі "Дажынкі", розных канцэртах. Спевы, напэўна, галоўнае захапленне Тамашэвіч. А яшчэ, прызналася дзяўчына, ёй даспадобы вышываць, вырошчваць кветкі і чытаць. Сярод любімых кніг — "Каласы пад сярпом тваім" і "Дзікае паляванне караля Стаха" Уладзіміра Караткевіча. А ў планах на будучае лета — падарожжы. Марыць пабываць у Нясвіжы, Вільнюсе, Санкт-Пецярбурзе — гарадах, якія многае значаць у беларускай гісторыі.

## Калегі

Ларыса Дзевяковіч, настаўніца гісторыі СШ N 2 горада Верхнядзвінска, наглядчыца школьнага гістарычна-краязнаўчага музея, педагог больш як з 40-гадовым стажам:

— Ад душы радавалася поспеху Дзіны. Як добра, што ёсць маладыя таленавітыя калегі, якім можна перадаць багаты назапашаны матэрыял. У нашым музеі, напрыклад, мноства ўнікальных экспанатаў. Ёсць дакументы, якія расказваюць пра дзейнасць спецыяльнага партызанскага атрада НКДБ БССР "Баявы" і Прошкаўскай камсамольскай інтэрнацыянальнай падпольнай арганізацыі, помнік якой усталяваны ля Кургана Дружбы. Там жа, на Кургане, мы сустракаліся з былымі байцамі 119-й ордэна Суворава стралковай дывізіі, якая вызваляла ў 1944-м Верхнядзвінск ад фашысцкіх захопнікаў. Некаторыя з іх прыязджалі з Расіі. Так што пра сумесную гераічную барацьбу народаў СССР падчас вайны нашы вучні ведаюць не толькі з падручнікаў.

Сяргей **Галеснік**

# Ні межаў, ні мытняў — і гэта выдатна...



**Народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін, які нядаўна адзначыў 70-годдзе, расказаў пра свае лепшыя ролі, пра здымкі ў серыялах і пра тое, чаму ён не любіць сучасныя фільмы**

## Галоўнае — адносіны

***— Уладзімір Васільевіч, вы часта негатыўна адгукаецеся пра расійскі кінематограф. Чаму ён вам не падабаецца?***

— Кіно сёння становіцца атракцыёнам, забавай: маючы вялікую колькасць тэхналогій, страчвае акцёрскую арганіку, найглыбейшы псіхалагізм перажыванняў, складанасць чалавечых узаемаадносінаў.

Адыходзіць страсны кінематограф, лепшыя ўзоры якога мы бачым у савецкім кіно. Вядома, і тады была маса кан'юктурных вырабаў, але я гавару пра карціны, якія стваралі знакамітыя рэжысёры. Іх фільмы можна глядзець бясконца: трапляеш, напрыклад, на "Вайну і мір" Бандарчука або "Ціхі Дон" Герасімава — і не можаш адарвацца. А фільмы-атракцыёны больш за адзін раз не паглядзіш.

***— Нядаўна вы прадстаўлялі фільм "Вока за вока", у якім сыгралі адну з галоўных роляў. Што для вас значыць гэтая работа?***

— Гэта апошні шэдэўр выдатнага майстра Генадзя Палокі. Фільм зняты паводле аповесці Барыса Лаўранёва "Сёмы спадарожнік". У аснове сюжэта — гісторыя пра белага генерала са знатнага дваранскага роду і махровага бальшавіка, якія аказваюцца ў ролях ахвяры і ката. У часы чырвона-белага тэрору пасля замаху на Леніна па ўсёй Расіі расстрэльвалі былых царскіх службоўцаў. У магілёўскім камендацкім доме іх расстрэлам загадваў мой герой — акопны служака Кухцін. І раптам паміж гэтым прасцякомбальшавіком і царскім генералам узнікае сувязь. Інтуітыўна разумеючы, што яны прадстаўнікі аднаго народа, гэтыя два чалавекі становяцца неабходнымі адзін аднаму.

Ідэя яднання была кроўна блізкая рэжысёру: два яго дзяды падчас Грамадзянскай вайны ваявалі ў процілеглых лагерах. "Усё гэта лухта, наноснае, — гаварыў мне Палока на здымках, — галоўнае, чалавечыя адносіны. Знішчаць адзін аднаго — гэта вар'яцтва".

Мы некалькі разоў прадстаўлялі "Вока за вока" на фестывалях у розных гарадах, двойчы ладзілі паказы ў Маскве, і я бачыў, з якімі ўзрушанымі вачамі людзі выходзілі пасля кінасеанса. Пры гэтым ніякай рэкламы не было, фільм мы знялі ў Беларусі за капейкі. Здымкі спынялі, і мне нават прыйшлося звяртацца па дапамогу да Аляксандра Лукашэнкі. Паглядзеўшы матэрыялы фільма, Прэзідэнт сказаў: "Працягвайце здымаць!"

## Асабісты вадзіцель Дзеда Мароза

***— Калі азірнуцца назад, у якіх карцінах вам было цікава здымацца?***

— У фільме "Ляўша" Сяргея Аўчарова. Ён здымае прытчы ў форме нейкага ачумелага гратэску. Некаторыя гледачы прызнаваліся, што не адразу "ўязджалі" ў яго стылістыку, але, калі ўжо гэта здаралася, зведвалі ўзрушэнне. Рад, што мне часта выпадала магчымасць здымацца ў такіх карцінах.

Люблю і свае серыяльныя ролі, над якімі доўга працаваў, расстаўляючы псіхалагічныя нюансы. З задавальненнем успамінаю работу ў шматсерыйным фільме "У лясах і на гарах" паводле Мельнікава-Пячэрскага, дзе я сыграў волжскага купца. Рэжысёр Аляксандр Замяцін валодаў матэрыялам, з ім было цікава працаваць. На здымачнай пляцоўцы ўвесь час адчувалася, як ён лепіць характары з гарачага, размятага пластыліну, нягледзячы на жорсткі серыяльны рэжым.

Спадабалася здымацца ў чатырохсерыйнай гісторыі "Доктар Смерць", дзе я іграў дрэннага хлопца, былога бандыта з 1990-х, які стаў масцітым бізнесменам. Мне быў цікавы гэты характар. Іншая справа, да фіналу аўтары аблегчылі гісторыю, скончыўшы яе стралянінай, а была магчымасць зрабіць так, каб герой нарэшце ўсвядоміў пустэчу мінулага жыцця і пачаў усё з чыстага ліста.

Цікава было працаваць над роляй следчага генпракуратуры ў серыяле "Грамадзянін начальнік-3". Пра карупцыю ў верхніх уладных пластах толькі цяпер пачынаюць гаварыць, а Генадзь Каюмаў зняў фільм пра гэта яшчэ ў 2005 годзе. Карціну сустрэлі з напружаннем, але мне падабаецца, што яна такая адкрытая і смела гаворыць пра заганы чыноўнікаў.

***— А як вам успамінаецца работа над фільмам "Узыходжанне"?***

— Гэты фільм вызначыў мой лёс у кіно. І адбылося ўсё дзякуючы вялікаму рэжысёру Ларысе Шапіцьцы. Усе ведаюць, што я пяць гадоў быў



На здымках фільма "Ёлкі 1914"



У серыяле "Дальнабойшчыкі"



У ролі дзядзькі Фрола ў фільме "Уласцімір"



На здымках фільма "Вылечыць страх"


У ролі дзядзькі Фрола у фільме "Уласцімір"


У фільме "Першы пасля Бога"


На здымках фільма "Падпаручнікъ Рамашоў"


На здымках фільма "Юнкеры"

рабочым сцэны ў Тэатры Савецкай арміі, таму што ніхто не даваў мне роляў. Дапамог выпадак — захварэў артыст, і Барыс Марозаў, цяпер галоўны рэжысёр тэатра, увёў мяне ў свой спектакль. І тут Ларыса Шапіцька запрасіла мяне на пробы ў карціну "Узыходжанне" паводле аповесці Васіля Быкава "Сотнікаў". На ролю Рыбака спрабаваліся Высоцкі і Губенка, але Ларыса зрабіла стаўку на невядомых акцёраў: на мяне і Барыса Плотнікава са свярдлоўскага ТЮГа. Мы адчувалі, што павінны памерці, але сыграць так, як трэба.

У Берліне наша карціна атрымала "Залатога мядзведзя". Але на фестываль ездзілі толькі Барыс з Ларысай — мяне не пусцілі, бо выканаўца адмоўнай ролі не мог прадстаўляць савецкае кіно за мяжой. Пасля "Узыходжання" я стаў здымацца ў тэлесерыяле "Хаджэнне па пакутах". Мяне звалі на работу ўсе тэатры. І Таўстаногаў запрашаў... Але я паехаў у Мінск, у Студыю кінаакцёра, дзе рэпеціраваў галоўную ролю.

***— Над чым працуеце цяпер?***

— Іграю ролю асабістага вадзіцеля Дзеда Мароза ў адным "атракцыёне" — гэта дзіцячая казка, фэнтэзі. А Дзед Мароз, кіраўнік карпарацыі Дзядоў Марозаў, паміж іншым, Фёдар Бандарчук. Ездзім на "Волзе", якая лёгка трансфармуецца ў санкі і наадварот. Роля ў мяне амаль без слоў.

## Радзіма: і ў Маскве, і ў Мінску — я ў сябе дома

***— На творчых сустрэчах вы любіце чытаць вершы Сяргея Ясеніна. Як вы адкрылі для сябе яго паэзію?***

— З творчасцю паэта мяне пазнаёміла мая настаўніца з самадзейнага тэатра. Я стаў чытаць Ясеніна і прачытаў усё, што было выдадзена ў той час. Гэты паэт аказаўся мне настолькі блізкім і так глыбока мяжуецца з маім станам душы, што на ўсё жыццё стаў родным.

Добра разумею яго і, калі чытаю са сцэны, адчуваю, як суперажывае зала. Уласна, я не чытаю вершы Ясеніна, я расказваю гісторыі, закладзеныя ў яго вершах: ад асобы млынара, млынарыхі, Прона Аглобліна. Ёсць у нас у Тэатры-студыі кінаакцёра музычна-паэтычная кампазіцыя па паэме "Ганна Снегіна", якая карыстаецца каласальным поспехам. Я паказваў яе ў Маскве, у Тэатры на Таганцы, дзе нас таксама цёпла прымалі.

***— На радзіме ў Екацярынбурзе часта бываеце?***

— Тры гады запар вёў там урачыстыя вечары "Героі Расіі" — з Валерыем Залатухіным, з Барысам Галкіным. Горад вельмі змяніўся з тых часоў, як я паехаў з яго. Але ёсць месцы, якія засталіся такімі ж. Аднойчы пасля дваццацігадовай адсутнасці я прыехаў да бацькі на юбілей і пешшу іх усе абышоў.

***— У Расіі і Беларусі адсвяткавалі Дзень яднання...***

— Шчаслівы, што будуем Саюзную дзяржаву. У гэтым для мяне маса пераваг. Асабліва цаню тое, што прыязджаю на сваю радзіму, як да сябе дадому. З паездкамі ніякіх праблем — ні меж, ні мытняў, і гэта выдатна. Але на маю думку, дык лепш за ўсё, калі б мы, як раней, жылі ў адзінай дзяржаве.

***— Як адзначылі свой нядаўні юбілей?***

— Не пытайце, я ўжо забыў пра гэта.

Ніна **Катаева**

**Даведка**

**Уладзімір Гасцюхін — савецкі і беларускі акцёр тэатра і кіно, кінарэжысёр. Нарадзіўся ў 1946 годзе ў Свярдлоўску. Скончыў ГІЦІС. Працаваў у Тэатры Савецкай арміі. З 1982 года акцёр Мінскага Тэатра-студыі кінаакцёра. Зняўся амаль у сотні фільмаў, сярод якіх "Узыходжанне", "Час выбраў нас", "Бераг", "Ляўша", "Урга: тэрыторыя кахання". Усенародную любоў акцёру прынесла роля Іваныча ў серыяле "Дальнабойшчыкі".**

**Народны артыст Беларусі, лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы, Дзяржпрэміі СССР і Дзяржпрэміі Расійскай Федэрацыі.**

# Сын за бацьку

## З Еўрапейскіх гульняў у Баку і з чэмпіянату свету ў Доху 19-гадовы Дзмітрый Асанаў прывёз срэбра і бронзу. Эксперты не сумняваюцца, што ў Бразіліі медальная традыцыя прадоўжыцца.

***— Твой бацька Сяргей Асанаў — знакаміты трэнер і рэферы па боксе. Таму ты трапіў на рынг?***

— Наадварот, бацька быў катэгарычна супраць, каб я надзяваў пальчаткі. Чаго толькі не перапрабаваў у дзяцінстве, — займаўся лёгкай атлетыкай, дзюдо, футболам. Але ўвесь час цягнула на рынг. Кожны дзень забягаў у спартыўную залу, назіраў, як баксіруюць яго падапечныя.

У выніку бацька здаўся, узяў мяне ў сваю групу. У 12 гадоў я выступаў на спаборніцтвах, біўся з хлопцамі, на чатыры гады старэйшымі. Потым паехаў на чэмпіянат Еўропы сярод школьнікаў, дзе выйграў свой першы міжнародны медаль.

***— Чаго чакаеш ад выступлення ў Рыа-дэ-Жанейра?***

— Спадзяюся выйграць. Хоць загадваць у спорце нельга — абавязкова сурочыш. Працую цяпер як пракляты. Дзве трэніроўкі ў дзень, плюс — ранішняя зарадка, па сутнасці, яшчэ адна трэніроўка. Адпачыць атрымліваецца толькі па нядзелях. Адсыпаюся, сустракаюся з сябрамі.

***— Некаторыя называюць бокс мардабоем. Цябе гэта не абражае?***

— Ніколькі. Людзі, якія так гавораць, нічога не разумеюць у нашым відзе. Бокс — як шахматы, спорт упераменшку з мастацтвам. Вельмі захапляльная гульня. Стараюся на рынг выходзіць з халоднай галавой, не піжоніць. Недаацэнка саперніка можа дорага абысціся. Галоўнае, што турбуе падчас схваткі, рукі майго саперніка, таму канцэнтруюся толькі на іх.

***— У якой манеры ты баксіруеш?***

— Існуе тры віды баксёраў: "гульцы", "спойлеры" і "панчары". У першых перавага ў хуткасці і тэхніцы. Другія разлічваюць на магутны ўдар, трэція з дапамогай хітрых прыёмаў перашкаджаюць баксіраваць саперніку, чакаючы моманту, каб самім нанесці рашаючы ўдар. Я — "Гулец". Лічу за лепшае на рынгу працаваць акуратна.

***— Чым цікавішся, акрамя бокса?***

— Музыкай. Футболам, хварэю за "Чэлсі". І, вядома, вучобай — я студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. У нас нават свая музычная група ёсць пад назвай "Лакацыя-67". Лакацыя — гістарычная назва мясцовасці, дзе знаходзіцца мой родны Маладзечна, 67 — яго тэлефонны код наадварот. Нас у групе двое. Сябар стварае музыку, а я пішу і чытаю рэп. Запісалі ўжо некалькі трэкаў. Наогул мая мэта, акрамя алімпійскага медаля, папулярызаваць спорт у Беларусі. Мару, каб у сучасных дзяцей было сапраўднае дзяцінства. Памятаю, як мы з хлопцамі ў двары ўсе дні напралёт гулялі ў футбол, хакей. Цяпер жа многія дзеці занадта замкнёныя на сабе і часцяком нават не ведаюць сваіх равеснікаў, якія жывуць у суседнім пад'ездзе. Па-мойму, гэта жахліва. Трэба з гэтым нешта рабіць. Лепшы сродак — спорт.

***— Якім павінен быць прафесійны баксёр: бязлітасным і жорсткім?***

— У першую чаргу добрым чалавекам, які ніколі не прымяніць байцоўскіх навыкаў за межамі рынга.

Эльвіра **Гарошка**




Дзмітрый Асанаў (зправа) нарадзіўся ў 1996 годзе ў Маладзечне. Майстар спорту міжнароднага класа. Выступае ў вазе да 56 кілаграмаў. Чэмпіён Еўропы сярод юніёраў. Бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2015 года, сярэбраны прызёр Першых Еўрапейскіх гульняў 2015 года, чэмпіён Беларусі

**Прамы нашчадак Людовіка XIV і кузіна ледзь не ўсіх цяперашніх еўрапейскіх каралёў прынцэса дэ Бурбон Пармская, здаецца, ужо прывыкла да няёмкай паўзы, якая ўзнікае ў журналістаў пры звароце да яе. За высокім тытулам хаваецца чароўная 55-гадовая брунетка, прэзідэнт Французкай асацыяцыі па пашырэнні мастацтва ў свет бізнесу, уладальніца ўласнага брэнда Princesse Tania de Bourbon Parme і пасол моднага дома куцюр'е Дэні Дзюрана.**
**На днях прынцэса дэ Бурбон Пармская разам з мужам Луі Арно Л'Ерб'е ўпершыню наведала Беларусь, дзе не толькі падтрымала даўняга сябра Дэні Дзюрана і адкрыла з ім першы франка-беларускі праект у галіне высокай моды Mir Couture, але і пазнаёмілася са спадчынай знакамітай княжацкай сям'і Радзівілаў.**

# У Міры пабывала прынцэса дэ Бурбон Пармская




Прынцэса Таня дэ Бурбон Пармская і французкі куцюр'е Дэні Дзюран на вернісажы ў Мірскім замку

Перад візітам у Мір прынцэса спецыяльна вывучыла сваё генеалагічнае дрэва — з Радзівіламі, як аказалася, яе звязваюць у тым ліку і роднасныя сувязі.

— Вытокі вядуць да лініі каралёў Даніі і Грэцыі. Унучку Георга I Грэчаскага завуць, дарэчы, Таццяна Радзівіл — гэта мая цётка. Калі Дэні Дзюран сказаў, што выстава яго ўбораў пройдзе ў замку, які належаў у свой час сям'і Радзівілаў, я вырашыла, што гэта лёс. Таму проста не магла адмовіцца ад запрашэння прыехаць у Беларусь.


БЕЛТА

Пасол Беларусі ў Францыі П.Латушка на прэзентацыі

Сам мэтр французкай моды ў нашай краіне ўжо бываў. Упершыню прыехаў тры гады назад — на цырымонію адкрыцця дваццатага кінафестывалю “Лістапад”. Тады па чырвонай дарожцы ў ашаламляльных уборах ад Дзюрана прайшліся зоркі беларускага тэатральнага і кінасвету. На гэты раз ад зорнага дэфіле куцюр'е адмовіўся. Перад класічным подыумным паказам аддаў перавагу фармату стацыянарнай выставы. Задуму дызайнер тлумачыць так:

— Калекцыя прадстаўлена выключна на манекенах спецыяльна для таго, каб у гасцей была магчымасць у дэталях разгледзець фурнітуру, тканіну, аксесуары — тое, што на подыуме часцяком застаецца незаўважаным.



Што характэрна, выстава Mir Couture размясцілася пад самымі скляпеннямі замка, на паддашку. І справа не ў тым, што пятнаццаці вытанчаным туалетам не знайшлося месца ў шырокіх княжацкіх пакоях. Мсье Дзюран і тут на правах гаспадара свята выказаў арганізатарам сваё пажаданне — знайсці для яго нешта традыцыйна беларускае:

— На мой погляд, менавіта гэтая камерная абстаноўка дапамагае сукенкам зайграць, у вялікай зале ўборы злёгку згубіліся б. Акрамя таго, тут аўтэнтычная атмасфера — менавіта такую я шукаў у гэтых сценах.

Праект нездарма пазначаны як франка-беларускі: суаўтарам некалькіх сілуэтаў выступіў модны мінскі дызайнер Апці Эзіеў. Яго задачай было разбавіць класічны стыль Дзюрана элементамі са скуры і металу.

Да творчай каманды таксама далучыліся ювелірны брэнд Zorka і дызайнер Аксана Вінаградава, кіраўнік брэнда ручнога ткацтва Heartiness — з іх тканіны французкі куцюр'е стварыў сціплую, але стыльную шлюбную сукенку. Прыклаў маэстра руку і яшчэ да аднаго ўбора — яго на вернісажы ў Міры прадставіла сама прынцэса Таня дэ Бурбон:

— З Дэні я супрацоўнічаю ўжо шмат гадоў. Колькі яго сукенак у маёй калекцыі? Каля дзесяці, думаю. Але гэта, спадзяюся, далёка не мяжа. У жыцці я аддаю перавагу апранацца сціпла, някідка. Шмат часу праводжу за пісьмовым сталом, але, калі выпадаюць моманты надзець вытанчаныя вячэрнія ўборы, з задавальненнем выкарыстоўваю магчымасць “выгуляць” сукенкі ад майго сябра Дэні.

Плануецца, што пасля Міра ўборы адправяцца туды, дзе пачынаўся іх шлях, — на Блакітны бераг Кан. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка таксама зазірнуў на вернісаж у Міры:

— Вельмі сімвалічна, што два буйныя праекты ў галіне культуры цяпер праходзяць у Беларусі і Францыі адначасова. У адзін дзень на I Беларускіх тэатральных сезонах у Парыжы наш Купалаўскі тэатр паказаў спектакль “Арт”, а тут, у Мірскім замку, адкрылася выстава французкага куцюр'е Дэні Дзюрана. Акрамя таго, у Мінску адбыліся беларуска-французскія кансультацыі паміж мінсітэрствамі замежных спраў. Усё гэта паказвае дынаміку нашых адносінаў. Важна, што пераплятаюцца менавіта культурны, эканамічны і палітычны складнік.

Юлія **Лявонава**

* * *

***Выстава вячэрняй і вясельнай сукенкі Mir Couture будзе знаходзіцца ў замку да 15 верасня 2016 г. Затым праект адправіцца ў Францыю.***

# Не столькі адзенне, колькі чыстае мастацтва




**Ад футуралагічных фантазій да строгай функцыянальнасці, ад хіпстарскіх штаноў да ўрачыстасці ручной працы — фінал XXV Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота "Млын моды-2016" сёлета шчыра парадаваў. Можа быць, падрастаючае пакаленне мадэльераў яшчэ не да канца аперылася, але ідэй у іх хоць адбаўляй. Чвэрцьвекавы юбілей "Млын" сустракае абноўленым, памаладзелым.**

## Адукацыйны кураж

Доўгі час мода была прэрагатывай Мінска: хочаш дабіцца чаго-небудзь у fashion-індустрыі — збірай рэчы і адпраўляйся ў вялікі горад, улівайся ў тусоўку: у родных пенатах так усё жыццё і прарабіш закройшчыкам у атэлье і якія ўжо табе подыумы! Сёння дзякуючы "Млыну моды", які нястомна калясіць па рэгіёнах, прасейвае канкурсантаў праз дробнае сіта, прэтэндаваць на поспех і прафесійнае ўдасканаленне можа любы талент з глыбінкі. Зрабіць першыя крокі і заявіць пра сябе можна, быўшы яшчэ нават не студэнтам, а школьнікам: імя для мадэльера — галоўны капітал, чым раней пачнеш яго зарабляць, тым лепш.

За апошнія гады "Млын моды" з творчага міжсабойчыку ператварыўся ў адзін з важнейшых культурна-адукацыйных праектаў Беларусі. Энтузіязму арганізатараў можна толькі апладзіраваць: 648 заявак з усёй краіны ў эскізным туры — вялікі вал прэтэндэнтаў, і год ад году іх становіцца ўсё больш. З кожным, дапушчаным да наступнага этапу, вядзецца работа: пачынаючых мастакоў моды кансультуюць, накіроўваюць, усяляк падтрымліваюць на ўсіх стадыях конкурсу. У фінальны тур пасля адбораў прайшло 88 калекцый, і няхай у масе сваёй яны невялікія па аб'ёме, да канца конкурсных паказаў сур'ёзна мільгае ў вачах. Як ва ўсёй гэтай разнастайнасці арыентуецца журы, можна толькі меркаваць: верагодна, прафесіяналы больш моцныя духам і ўстойлівыя, чым староннія глядач.

Мода — справа не толькі працаёмкая, але і затратная. Малады дызайнер Ілья Ківака з Баранавічаў прызнаўся, што без дапамогі сваёй навучальнай установы наўрад ці змог бы дазволіць сабе ўдзел у конкурсе:

— Мне 20 гадоў, я вучуся ў Баранавіцкім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы сферы абслугоўвання па спецыяльнасці "Мадэльер-канструктар". Вельмі добрая спецыяльнасць! Мне падабаецца вучыцца, я заўсёды любіў маляваць і прыдумляць нешта новае. У "Млыне моды" ўдзельнічаю ўпершыню і ўдзячны ўсім, хто садзейнічаў гэтаму. Кіраўніцтва каледжа дапамагло з тканінай, таму затраты на стварэнне калекцыі былі мінімальнымі.



ТАЦЦЯНА СТАЛЯРОВА

## Дзіцячая мода — у першых радах

Як звычайна, на фестывалі шмат замежных гасцей — мадэльераў і кіраўнікоў школ моды, у тым ліку ў журы: яны ўважліва прыглядаюцца і выбіраюць шчаслівчыкаў, якія пасля "Млына моды" раз'едуцца па прэстыжных замежных конкурсах і стажыроўках. Саніта Бламніеце, якая прадстаўляе fashion-конкурс Habitus Baltia, што праходзіць у Латвіі, прызналася, што ў яе ёсць канкрэтная мэта:

— З "Млынам моды" мы супрацоўнічаем ужо некалькі гадоў і штогод запрашаем аднаго з канкурсантаў на фінал міжнароднага конкурсу Habitus Baltia, які праходзіць у Рызе. Я тут ужо другі раз і летась была ў захапленні ад дзіцячых калекцый, менавіта такую хачу выбраць.

Што ж, у пытаннях дзіцячай моды беларусы зусім не ў ліку адстаючых: Таццяна Карпалава і Святлана Вараб'ёва з Гомеля, Крысціна Гагуцкая і Анастасія Дарожкіна з Віцебска, Аліна Дайнека са Светлагорска — мастакоў шмат. Усе яны прапануюць модныя рашэнні для дзяцей — ад зручных камбінезончыкаў хоць на баль, хоць у свет, хоць у пясочніцу, да пышных, складана пашытых убораў а-ля прынцэса.

Асобнага слова заслугоўваюць мадэльеры, якія прадстаўляюць калекцыі, што прама цяпер можна запускаць у вытворчасць: напрыклад, дызайнер Юлія Голях з Жодзіна, якая працуе ў ААТ "Світанак", парадавала чароўнай серыяй убораў для дзяўчынак, якія бацькі літаральна змятуць з магазінных паліц, калі яны там з'явяцца. Менавіта такі падыход патрэбны ў першую чаргу нашай лёгкай прамысловасці: уборы ад куцюр можа дазволіць сабе не кожны, але кожны хоча прыгожа апрануцца сам і апрануць сваё дзіця.

***Сёння дзякуючы "Млыну моды", які нястомна калясіць па рэгіёнах, прасейвае канкурсантаў праз дробнае сіта, прэтэндаваць на поспех і прафесійнае ўдасканаленне можа любы талент з глыбінкі***

## Для моцных і стыльных

Дарэчы, на што яшчэ звяртаюць увагу замежныя госці: на "Млыне моды" традыцыйна шмат мужчынскіх калекцый, што, наогул кажучы, рэдкасць: скажам, у Расіі, па прызнанні Таццяны Міхалковай, падчас адбораў на міжнародны конкурс "Рускі сілуэт" жадаючых ствараць адзенне для мужчын даводзіцца яшчэ пашукаць. Гэта на вялізных расійскіх прасторах! А ў Беларусі — наце вам, дзіўная разнастайнасць.

Аляксандра Жук і Дарына Коваль вывелі на подыум тыповых гараджан-хіпстараў, бабруйчанка Паліна Зюзгіна — гэтакіх брутальных анёлаў мегаполіса ў тоўстых вязаных світарах са скуранымі аплікацыямі. А дуэт Ганны Гладкай і Ірыны Крывадубскай моцна ўразіў калекцыяй "Воіны новага свету": тут табе і змрочны авангард, і стымпанк са скуранымі цыліндрамі і акулярамі-гоглямі, роспісы, заклёпкі, проразі... Словам, постапакаліптыка — хоць цяпер у блокбастар пра жыццё пасля сусветнай...

З заміраннем сэрца паварочваюся ў бок журы: знакамітыя майстры расчахлілі смартфоны і адстрэльваюць кадры кароткімі чэргамі. Гэта ўжо не столькі адзенне, колькі чыстае мастацтва — а значыць, апладысменты!

Ірына **Яўсеева**

# Карціны як факты з біяграфіі краіны

## З асаблівасцямі развіцця айчыннага мастацтва ў кантэксце традыцый і сучаснасці, творчай пераемнасці ды эксперыментальных пошукаў знаёміць выстава "Сучасная Беларусь вачамі мастакоў", якая адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі

Сёння відавочна, што атрыманне суверэнітэту Рэспублікай Беларусь у 1991 годзе азнаменавала і цалкам новы этап мастацкай культуры. За гады незалежнасці ў грамадстве адбыліся істотныя змены, пачаўся працэс абнаўлення, рэалізацыі інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу. А галоўнай асаблівасцю развіцця выяўленчага мастацтва, якая абумовіла яго небывалы наватарскі пошук і самабытнасць, стала магчымасць свабоднай творчай самарэалізацыі мастакоў без ранейшай ідэалогіі і цэнзуры.



Працэсы трансфармацыі культурнай рэальнасці намецілі змену некалі адзінай мастацкай канцэпцыі разнастайнасцю новых напрамкаў, жанраў і форм. У выяўленчым мастацтве гэтага часавага адрэзка адбіліся маральныя задачы сучаснасці, праламаліся і трансфармаваліся найбольш ёмістыя ідэі і тэндэнцыі. Сярод іх першарадным было пытанне нацыянальнай культурнай самаідэнтыфікацыі, асэнсаванай неабходнасці зразумець сябе ў межах сваёй культуры, знайсці апору ў роднаснай глебе.

У гэтай сітуацыі ў творчасці многіх беларускіх мастакоў прасочваецца абвостраная цікавасць да нацыянальных традыцый, акцэнт на тэме каранёў і вытокаў. Яны чэрпаюць натхненне ў традыцыях этнакультуры, народных звычаях і паэтычнай спадчыне. Адзначаецца павышаная цікавасць да фальклорнага матэрыялу, да інтэрпрэтацыі народных святаў, легенд, паданняў і прыпавесцяў. У творчасці Мікалая Селешчука, Зоі Літвінавай, Мікалая Бушчыка, Васіля Касцючэнкі, Уладзіміра Кожуха, Віктара Альшэўскага элементы этнакультуры, розныя сімвалы і знакі арганічна ўпісваюцца ў кантэкст сучаснага мастацтва, суіснуючы з авангардысцкімі пластычнымі прыёмамі і прынцыпамі, што надае ім абсалютна новае гучанне. І пра гэта нагадвае цяперашняя экспазіцыя "Сучасная Беларусь вачамі мастакоў", прадстаўленая ў галоўным музеі краіны.

У сувязі з нацыянальнай ідэяй у творчасці многіх беларускіх мастакоў узяла верх гістарычная тэма. Аднаўленне сапраўдных гістарычных каардынат, рэканструкцыя вобразаў далёкага мінулага, незаслужана забытага і выцесненага з гісторыі мастацкай спадчыны, не абышло сваёй увагай прадстаўнікоў розных пакаленняў мастакоў. Цікавасць да гістарычных асоб і знакавых падзей мінулага краіны



Выстава не пакідала наведвальнікаў, асабліва моладзь, абыякавымі

дэманструюць у сваіх работах Міхаіл Савіцкі, Леў Гумілеўскі, Іван Міско, Святлана Гарбунова, Аляксандр Чыгрын. Гістарычныя рэканструкцыі слаўных перамог і падзей нацыянальнай гісторыі, легенды пра веліч герояў узнаўляюць у аўтарскіх творах Міхаіл Басалыга, Уладзімір Савіч, Уладзімір Басалыга. Вядомыя гістарычныя архітэктурныя помнікі і вобразы ў своеасаблівай постмадэрнісцкай гульні ажываюць на палотнах Уладзіміра Тоўсціка, Георгія Сітніцы.

Пошукі новых духоўных асноў развіцця грамадства абумовілі актуалізацыю рэлігійнай тэмы. Духоўная праблематыка раскрываецца як у творчасці майстроў старэйшага пакалення, народных мастакоў Беларусі Міхаіла Савіцкага, Гаўрыіла Вашчанкі, так і ў творчасці мастакоў “новай хвалі” Наталлі Залознай, Ігара Цішына.

Дыяпазон творчых пошукаў беларускіх мастакоў быў звязаны не толькі з тэндэнцыямі “гістарызму” і “нацыянальнага адраджэння”, але таксама і з імкненнем пазнання творчых практык гістарычнага авангарда. Сярод усёй разнастайнасці жанраў паказальным стаў агульны інтарэс да беспрадметных, абстрактна-знакавых форм адлюстравання, які ўвасобіўся ў творчасці Анатоля Кузняцова, Сяргея Кірушчанкі, Галіны Гаравой.

Безумоўна, перыяд незалежнасці ўнёс новы змест ва ўсе віды мастацтва. Нараўне з жывапісам актыўна развіваюцца скульптура, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. У тэматыцы многіх выстаўленых твораў знайшлі месца гістарычныя фігуры, архаіка, вобразы жывой прыроды, навакольнага свету, арнаментальныя матывы, характэрныя ў цэлым для мастацкай культуры перыяду незалежнасці.

Гэта агульнае меркаванне ў асяроддзі беларускіх мастакоў — Віталь Цвірка быў і застаецца непераўзыдзеным майстрам пейзажа. Так, творчасць майстра — гэта сапраўдная з’ява ў мастацкай культуры Беларусі, якая падзяліла існаванне жанру пейзажа ў айчынным выяўленчым мастацтве на тое, што было “да” Цвіркі, і тое, па якім шляху ён развіваецца цяпер. Віталь Цвірка па праву лічыцца наватарам, першаадкрывальнікам у стварэнні асаблівага тыпу лірычнага пейзажа, невядомага да гэтага ў беларускім мастацтве. Менавіта ў жанры пейзажа Віталь Цвірка найбольш поўна раскрыў лепшыя бакі свайго таленту, характар беларускай прыроды, філасофскія разважанні. Ён умеў улавіць у кожным матыве тое галоўнае, што складае яго сутнасць, пры гэтым свае жывыя, яркія ўражанні віртуозна абагульняў сучаснымі выяўленчымі прыёмамі. Мастак стварыў палотны эпічнага гучання, абагульненыя вобразы — сімвалы роднай зямлі, шматлікія пейзажы-сказанні, якія сталі класікай беларускага жывапісу. У творах Віталя Цвіркі практычна заўсёды адсутнічаюць знешнія прыкметы часу. Пры гэтым сам вобразны лад яго карцін, арыгінальнасць кампазіцыйных рашэнняў, магутны каларыт, экспрэсіўны мазок адпавядаюць духу эпохі, у якой жыў і тварыў маэстра.

Сваёй творчасцю гэты выдатны мастак шмат у чым заклаў традыцыі, па якіх сёння працягвае развівацца беларускі пейзажны жывапіс. Быўшы яркім, адораным, энергічным чалавекам, Віталь Цвірка бліскуча праявіў сябе і як педагог, які выхаваў цэлую плеяду вучняў, многія з якіх у далейшым унеслі свой непаўторны ўклад у развіццё айчыннага мастацтва. Магчыма, што без Цвіркі не склалася б школа беларускага жывапісу ў тым выглядзе, у якім існуе яна цяпер. А сярод шматлікіх студэнтаў Віталь Канстанцінавіч асабліва вылучаў Леаніда Шчамялёва, Дзмітрыя Алейніка, Барыса Аракчэева, Мікалая Казакевіча, Георгія Паплаўскага, Івана Рэя — тых, хто пасля таксама ярка заявіў пра сябе.

— Ён быў неабыякавы да ўсяго, — успамінае Леанід Шчамялёў. —

Дзесьці ў канцы пяцідзясятых гадоў у Маскве ўпершыню выстаўляліся карціны са збораў Дрэздэнскай галерэі. Людзі начамі стаялі ў чарзе, каб паглядзець шэдэўры сусветнага жывапісу. А Віталь Цвірка здолеў дамовіцца (не ведаю, як гэта яму ўдалося), што мы, цэлая група студэнтаў з Мінска, змаглі паехаць у Маскву і цэлы тыдзень наведвалі выставу бясплатна. Незабыўна дагэтуль, і, вядома, засталася вялікая павага да гэтага дзіўнага чалавека.

Вытокі творчасці Віталя Цвіркі вядуць у далёкую пару юнацтва, якое прайшло на Гомельшчыне. Чароўнасць сельскіх фарбаў, паэтычныя і спеўныя матывы прыроды пакінулі адбітак у сэрцы юнака. Паслярэвалюцыйная вёска, дзе бурліла жыццё, дзе моладзь імкнулася ажыццявіць свае мары, адкрыла шлях і для Віталя Цвіркі ў прывабны і нязведаны свет мастацтва. Любоў да малявання прывяла будучага мастака ў Віцебскі мастацкі тэхнікум. У 1932 годзе Віталь скончыў тэхнікум, а ўжо ў 1935 годзе ўдзельнічаў у мастацкай выставе ў Маскве, поспех у якой прывёў да паступлення ў Маскоўскі мастацкі інстытут імя Сурыкава. Сёння творы Віталя Цвіркі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве ды іншых музеях Расійскай Федэрацыі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчых музеях Беларусі, а таксама прыватных калекцыях Беларусі і замежных краін. Збор карцін Віталя Цвіркі ў Нацыянальным мастацкім музеі — 156 твораў — з'яўляецца адным з самых вялікіх.

Уласна, і творчасць Леаніда Шчамялёва дае магчымасць убачыць непаўторную прыгажосць роднай прыроды, разнастайнасць навакольнага свету, высакароднасць і годнасць самога чалавека. Мастацтва Леаніда Шчамялёва зачароўвае натуральнасцю, прастатой і непатрабавальнасцю сюжэтаў, чароўнасцю і прыгажосцю, якой літаральна струменяць яго карціны і якія ўспрымаюцца як натуральныя якасці жывапісу. Сёння Леанід Шчамялёў — шырока вядомы майстар сучаснага беларускага мастацтва. Ён удастоены звання народнага мастака і звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны прэстыжным медалём Францыска Скарыны. На рахунку мастака дзясяткі персанальных выстаў у сябе на Радзіме і за мяжой, удзел у Сусветных і міжнародных мастацкіх форумах. Яго творы набылі многія мастацкія музеі і карцінныя галерэі свету, прыватныя калекцыянеры з Беларусі, Расіі, Украіны, ЗША, Канады, Італіі, Францыі, Германіі, Іспаніі, Аўстраліі, Ірана, Ізраіля.

***Аднаўленне сапраўдных гістарычных каардынат, рэканструкцыя вобразаў далёкага мінулага, незаслужана забытага і выцесненага з гісторыі мастацкай спадчыны, не абышло сваёй увагай прадстаўнікоў розных пакаленняў мастакоў***

Леанід Шчамялёў — мастак, які аддаў увесь свой прафесійны досвед развіццю беларускай выяўленчай культуры, майстар, чый уплыў на творчасць многіх сучасных беларускіх жывапісцаў шматгранны і плённы. Уласна, і наша гутарка ў майстэрні мастака ўжо пасля наведвання выставы ў музеі была менавіта на гэтую тэму.

***З аўтабіяграфіі народнага мастака Беларусі Л. Шчамялёва:***

— Мне пашанцавала. Я нарадзіўся ў Віцебску, горадзе мастакоў. Дзяцінства прайшло ў асяроддзі аматараў жывапісу. Праўда, гэта былі самадзейныя мастакі, і ўсё ж фарбы, палотны, пахі свежанапісаных карцін я спазнаў рана. Побач была Дзвіна — рака, якая дагэтуль для мяне свяшчэнная. Уражанні дзяцінства — захапленні зімовых прагулак на лыжах, летнія радасці на беразе Дзвіны, паездкі ў вёску да бабулі і, вядома, кіно. Абарвала ўсё гэта вайна. У 1941-м я пайшоў, як і іншыя, ваяваць. У 1943-м годзе пры вызваленні Беларусі пад Мазыром быў цяжка паранены. Пасля шпіталя зноў ваяваў. Словам, прайшоў цяжкі шлях страшнай вайны стагоддзя. Лёс захаваў мяне, я стаў вучыцца ў Мінску ў мастацкім вучылішчы. Пазней працаваў як педагог і, нарэшце, паступіў у мастацкі інстытут у Мінску. Мне зноў пашанцавала — я стаў вучнем Віталя Канстанцінавіча Цвіркі. Выдатны мастак і педагог, ён адкрыў для мяне магчымасць бачыць свет, як я яго разумею. Цяжка перажыў першыя творчыя няўдачы, але неўзабаве стаў выстаўляцца на многіх выставах у Мінску, Маскве, за мяжой. Жыццё мастака для мяне — лепшае, што створана богам. Захапленне навакольным светам, адлюстраванне дзіўных парадоксаў, радасць творчасці робяць мяне шчаслівым.

***— Ваш настаўнік Віталь Цвірка лічыў за лепшае пазбягаць усякага роду публічных выступленняў — яго жывапіс быў больш красамоўны за словы. Да якой катэгорыі мастакоў адносіце сябе Вы?***

— Я адношу сябе да ліку людзей, якія любяць сваю прафесію і, калі



трэба, могуць сказаць звычайнай чалавечай мовай пра тое, што думаюць. Вядома, я не даследчык ні ўласнай творчасці, ні тым больш творчасці іншых мастакоў, але калі размова заходзіць пра майго настаўніка Віталя Цвірку, я магу гаварыць шмат і ўдзячна, захапляючыся ім як мастаком і чалавекам. Калі шмат і доўга вучышся, то над табой "працуюць" многія выкладчыкі, але Настаўнікам усё-такі застаецца адзін — той, хто навучыў галоўнаму, дапамог пераадолець доўгі і цяжкі шлях да прафесіі мастака, да ўсведамлення ўласнай ролі ў мастацтве і меры адказнасці за тое, што робіш. Віталь Цвірка быў для мяне менавіта такім настаўнікам. Быўшы вялікім мастаком, ён умеў даваць не толькі ўрокі прафесійнага майстэрства, але і прыклады чалавечнасці, любові да роднай прыроды, якую ён востра адчуваў і любіў да самазабыцця.

***— Ці не таму і ў Вашай творчасці пераважаюць карціны прыроды, матывы самых разнастайных станаў і настрояў у ёй?***

— "Чыстых" пейзажаў сярод маіх твораў параўнальна няшмат. У асноўным у іх закладзены прынцып карціннай пабудовы палатна, дзе прысутнічае не толькі пейзаж, але і нейкае дзеянне, рух людзей і жывёл — яны не толькі дапаўняюць і ажыўляюць пейзаж, але лагічна звязаныя з ім, а гэта ўжо карціна. А ў самой карціне





я шукаю не сюжэт — гэта заўсёды сачыненне на зададзеную тэму, а факт з жыцця. Імкнуся асэнсаваць яго і паказаць гледачу. Я пішу само жыццё, нічога не прыдумляючы.

***— Якія Вашы адносіны да тых часоў, калі ў выяўленчым мастацтве панаваў сацрэалізм?***

— Я хачу сказаць, што таленавітыя майстры заўсёды знаходзілі спосабы рэалізаваць свае творчыя здольнасці, ствараючы часам сапраўдныя шэдэўры жывапісу. Адной з самых вялікіх заган сацрэалізму было навязванне ўмоў для ўсякага роду паддобрывання да сістэмы, якая яго стварыла, як спосабу набыцця разнастайных прывілеяў, званняў, пасад і да т. п. Вядома, тут вялікае значэнне мелі асоба мастака, яго жыццёвая пазіцыя. Адны гэтай хваробай заражаліся, другія — не, але небяспека спакусы была. Што датычыцца майго дачынення да гэтай тэрміналогіі і ці шмат у мяне карцін на "гістарычна-рэвалюцыйную тэму", то адназначна адказаць цяжка, а па-іншаму — доўга. Тэма рэвалюцый і войнаў — гэта ж не абавязкова адлюстраванне людзей, якія страляюць. Часам дастаткова паказаць твар аднаго чалавека, каб меркаваць пра лёс цэлага пакалення.

***— Мяркуючы па Вашай біяграфіі, Вы шмат ездзілі па нашай тады шырокай краіне, бывалі і ў Еўропе, і ў Азіі. Што давалі Вам гэтыя паездкі як мастаку, што Вы шукалі, што хацелі зразумець?***

— Ездзіў я сапраўды шмат і, перш за ўсё, па краіне: тады яшчэ Савецкім Саюзе. Усе пятнаццаць саюзных рэспублік былі "асвоеныя" па ўсіх напрамках, заставаўся толькі Далёкі Усход. Шмат бываў і за мяжой. Вынікам кожнай паездкі заўсёды быў шырокі мастацкі матэрыял. Але самым галоўным і каштоўным сэнсам усіх гэтых паездак была магчымасць параўнаць, супаставіць убачанае з тым, што я бачыў і ведаў у Беларусі: менавіта ёй я хацеў прысвяціць АСНОЎНУЮ частку сваіх твораў. І ведаеце, што я зразумеў? Тое, што ведаў заўсёды: любое прафесійнае мастацтва ўзрастае, жывіцца і расцвітае толькі на глебе роднага — народнай творчасці, сваёй культуры, сваіх традыцый. Мастак можа дасягнуць дзіўных вяршыняў, быць вядомым у сваёй краіне і нават падняцца да ўзроўню сусветнага прызнання, стаць, так сказаць, "наднацыянальным" мастаком, толькі пры адной умове: калі ён у сваёй творчасці здольны адбіраць, перапрацоўваць, прафесійна адшліфоўваць тое, што з'яўляецца ўнікальным і непаўторным у мастацтве. І, у рэшце рэшт, гатовы прадставіць гэта свету як агульначалавечую каштоўнасць.

***— Вы сказалі, што падчас паездак атрымалі магчымасць параўноўваць і супастаўляць убачанае з радзімай. Што, на Ваш погляд, адрознівае Беларусь ад іншых краін? Якой яна можа паўстаць чалавеку, які ўпершыню прыехаў сюды?***

— Першае, што павінна ўразіць — гэта прырода. Беларусь пакрыта цэлай сістэмай чыстых крынічных азёр, сеткай вялікіх і малых рэк, якія



перасякаюць яе тэрыторыю ўздоўж і ўпоперак. Усё гэта забяспечвае мясцовай прыродзе такую свежасць і сакавітасць фарбаў, якая не можа не кінуцца ў вочы. Наша прырода практычна не вяне, яна толькі мяняе фарбы ў залежнасці ад пор года, застаючыся яркай і свежай. Сакавітая зеляніна вясновага і летняга цвіцення можа змяніцца дзіўнымі тонамі і паўтонамі восені. Але яны толькі дапаўняюць і ўскладняюць агульнае колеравае гучанне прыроды, робяць яе ўрачыстамажорнай. А як яна мяняецца ўзімку — гэтая чысціня і белізна снегу, гэтыя карункі пакрытых інеем дрэў робяць прыроду Беларусі чароўнай і непаўторнай. Яна не бывае стомленай, знясіленай сонцам ці здранцвелай ад моцных маразоў — яна заўсёды жывая і свежая. Напэўна, менавіта гэтым можна растлумачыць тое, чаму сярод беларускіх мастакоў заўсёды было шмат цудоўных пейзажыстаў.

***— Сярод Вашых твораў партрэтнага характару шмат партрэтаў блізкіх Вам людзей.***

— Як і ўсякі мастак, я выбіраю тое, што люблю, і тое, што мне імпануе. Я люблю блізкіх мне людзей і пішу іх з задавальненнем. Але не з меншым задавальненнем я пішу і партрэты тых, хто блізкі мне па духу, па перакананнях. І, на мой погляд, яны цудоўныя такія, якія ёсць.

***— На мастацкіх выставах розных гадоў даводзілася бачыць Вашы нацюрморты, яны ёсць і тут, у майстэрні — такія ж яркія, эмацыйныя, прыгожыя, як большасць Вашых твораў. Вас не бянтэжыць правакацыйнае слова "прыгожы"? Бо зусім нядаўна гэтае слова ставілася крытыкамі ў адзін шэраг са словамі "прыгожасць", "карціннасць", "салоннасць"?***

— Мне падаецца, што быць прыгожым — адна з якасцяў і функцый мастацтва. Нездарма пісьменнік-класік недвухсэнсоўна заявіў, што менавіта "прыгажосць выратуе свет". Чаму ж да гэтага трэба ставіцца адмоўна? Любы твор мастацтва павінен быць у першую чаргу прыгожым, бо яго стварае мастак. А жывапіс тым больш — яму дадзены фарбы. Прырода цудоўная і прыгожая таму, што яна шматкаляровая. Выкіньце з яе фарбы — і вы ўбачыце пустыню. І як сказаў адзін добры мастак: вучыцеся ў прыроды, і вы створыце сапраўднае мастацтва. Поўным глыбокай пашаны дачыненнем да прыгажосці працята і народная творчасць, а гэта крытэрый, які ніколі не можа быць ілжывым, памылковым.

***— Як Вам удаецца ў наш час не разгубіцца?***

— Мастакам заўсёды было цяжка. Асабіста я заўсёды нешта пераадольваў, чагосьці пазбаўляўся, ад чагосьці пакутаваў. Я чалавек жорсткага ваеннага і цяжкага пасляваеннага часу, які загартаваў мяне, як гаворыцца, на ўсё астатняе жыццё. І ведаеце, сёння мне зусім не цяжка, таму што калісьці было яшчэ цяжэй. Маё мастацтва яшчэ камусьці трэба. І я хачу, каб яно радавала іншых, каб яно прысутнічала на выставах і ў кнігах. Людзі, пакуль яны жывыя, у самых цяжкіх умовах будуць цягнуцца да прыгожага, да духоўнага, да дасканалага. І я веру ім — героям маіх твораў.

Несумненна, выяўленчае мастацтва Беларусі ўяўляе з сябе сістэму, якая дынамічна развіваецца, у якой традыцыйныя віды і інавацыйныя формы, дапаўняючы адзін аднаго, ярка выяўляюць рысы культурнай ідэнтычнасці. Магчыма, таму не існуе галоўнай стылістычнай тэндэнцыі. Класічны рэалізм і абстракцыя, імпрэсіянізм і экспрэсіянізм суседнічаюць на выставе, раскрываючы поліфанічны, разнастайны характар сучаснага нацыянальнага мастацтва.

А выстава "Сучасная Беларусь вачамі мастакоў" дае ўнікальную магчымасць наведвальнікам пазнаёміцца з творамі аўтараў розных пакаленняў, розных творчых памкненняў і напрамкаў, арыентаваных на класічнае мастацтва і эксперыменты, якія звярталіся да ўвасаблення агульначалавечых каштоўнасцяў і да пошуку нацыянальнай ідэі. У экспазіцыі прадстаўлены створаныя за перыяд незалежнасці новыя творы такіх класікаў беларускага жывапісу, як Л. Шчамялёў, Г. Вашчанка, В. Грамыка, П. Масленікаў, А. Кішчанка, М. Данцыг, У. Стальмашонак, А. Бараноўскі, карціны мастакоў сярэдняга пакалення, а таксама работы стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Выстаўленыя творы арыгінальныя ў творчым выкананні, яны — індывідуальныя. Але ўсіх аб'ядноўвае адно — узвышаная тэма незалежнасці краіны, яе багаты гістарычны набытак і настойлівая накіраванасць у будучыню.

Веніямін **Міхееў**



М. Бушчык. “Купальскі ранак”. Цэнтральная частка трыпціха “З думай аб Радзіме”. Палатно, алей. 2002